Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 206 (29828)

«СЛОВА «ТАТА» ПІШЫЦЕ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ

Сямейная кніга

ЗА ШТО «З'ЕЛІ» СТАРШЫНЮ ТАВАРЫСТВА

Сямейная кніга

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:

«Сельская гаспадарка — тая галіна, якая будзе нас істотна цягнуць да станоўчых вынікаў. Па выніках дзевяці месяцаў забяспечаны рост на 4,9 працэнта. Гэта звязана з больш высокім ураджаем практычна ўсіх культур — збожжавых і зернебабовых, цукровых буракоў, іншай агародніны. Ураджайнасць толькі па збожжавых (без уліку кукурузы) сёлета вышэйшая амаль на 19 %. Важна, што мы ўжо практычна сфарміравалі стабілізацыйныя фонды, залажылі агародніну на міжсезонны перыяд. Рост у нас назіраецца і па арганізацыях Мінпрама, «Белдзяржхарчпрам» таксама выйшаў з адмоўнай зоны. Калі Мінпрам і «Белдзяржхарчпрам» усяляюць нам аптымізм, то сельская гаспадарка — упэўненасць, таму што пытанні харчовай бяспекі мы вырашаем».

На рынгу — браты Арловы

Фота БелТА.

Блізняты Мацвей і Максім АРЛОВЫ з Віцебска амаль сем гадоў паспяхова займаюцца кікбоксінгам — хлопцы ездзяць на розныя спаборніцтвы і прывозяць медалі прызёраў і пераможцаў. Сваімі поспехамі яны ў многім абавязаны бацьку. Старшы оперупаўнаважаны аддзела па раскрыцці цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць асобы ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі УУС Віцебскага аблвыканкама Юрый Арлоў не толькі ўхваляе спартыўнае захапленне сыноў, але і дапамагае ім у трэніроўках.

Будзьце здаровы!

ДАПАМОГА НА КОЛАХ

Як даехаць да амбулаторыі? Пытанне, якое асабліва турбуе жыхароў аддаленых населеных пунктаў Глыбоччыны, нарэшце вырашылася. Цяпер вяскоўцаў, якія клапоцяцца аб здароўі, абслугоўвае не толькі выязная брыгада амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, але і цэлы медыцынскі комплекс, што максімальна спрашчае агляд пацыентаў.

Глыбоцкая цэнтральная раённая бальніца першай у паўночным рэгіёне пачала абслугоўваць насельніцтва аддаленых населеных пунктаў раёна ў перасоўным медыцынскім комплексе, які быў набыты з мэтай паляпшэння якасці медыцынскага абслугоўвання і максімальнага тэрытарыяльнага ахопу. На гэты важны медыцынскі аб'ект са сродкаў раённага бюджэту было выдзелена звыш 300 тысяч рублёў.

Сёння насельніцтва Глыбоцкага раёна абслугоўваюць 8 амбулаторый (у дзвюх з іх працуюць стацыянарныя аддзяленні) і 21 фельчарска-акушэрскі пункт. Тэрыторыя ахопу вялікая — ад крайняга населенага пункта да цэнтральнай бальніцы 60 кіламетраў. Але для людзей пажылога ўзросту, з абмежаванымі магчымасцямі, дайсці нават да ФАПа — задача складаная, тым больш што ў восеньскі або зімні сезон дарогу да ўрача ўскладняюць умовы надвор'я. Вестка аб тым, што цяпер дактары прыедуць да кожнага, каму патрэбная дапамога, разнеслася і была пазітыўна ўспрынята па ўсёй Глыбоччыне.

СТАР. 15

Актуальна

Пра сваю пенсію паклапаціцеся загадзя

Калі будучы пенсіянер працуе, падрыхтоўкай пакета дакументаў для афармлення пенсіі займаецца кадравая служба арганізацыі. А вось індывідуальным прадпрымальнікам, рамеснікам, самазанятым, людзям, якія працуюць у мікраарганізацыях, дзе няма паўнавартаснай кадравай службы, і тым, хто страціў работу ў перадпенсіённым узросце, давядзецца ўсе гэтыя клопаты ўзяць на сябе. Якія дакументы і калі трэба пачынаць збіраць для атрымання працоўнай пенсіі па ўзросце?

ТРЫ ЎМОВЫ ДЛЯ ПРЫЗНАЧЭННЯ

Права на атрыманне працоўнай пенсіі па ўзросце надыходзіць для жанчын у 58 гадоў, для мужчын у 63 гады пры яшчэ дзвюх важных умовах. Першая: у перыяд працоўнай дзейнасці яны падлягалі абавязковаму сацыяльнаму страхаванню і за іх выплачваліся ўзносы ў ФСАН. Другая: агульны працоўны стаж памерам у 20 гадоў для жанчын, у 25 — для мужчын.

КУДЫ ПАДАВАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

Заяву аб прызначэнні працоўнай пенсіі падаюць ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы рэгістрацыі. Узор заявы можна спампаваць на сайтах адпаведных упраўленняў. Пры неабходнасці спецыялісты ўпраўлення па працы і сацабароне могуць аказаць дапамогу ў атрыманні неабходных дакументаў.

СТАР. 4

КАРОТКА

- У Беларусі больш як 43 працэнты ўведзенага ў студзені — верасні жылля пабудавана для тых, хто мае патрэбу.
- **Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» стартуе 15 снежня.**
- Беларусь і Таджыкістан знайшлі новую сферу ўзаемнай цікавасці — перапрацоўку гарбарнай сыравіны.
- **Мірскую батлейку плануюць уключыць у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.**
- Беларусь і Індыя могуць стварыць сумеснае прадпрыемства па распрацоўцы беспілотнікаў.

ISSN 1990 — 763X

Парламенцкі дзённік

Будаўніцтва жылля, рамонт дарог, забеспячэнне вадой і транспартам

Віцэ-прэм'ер Анатоль Сівак і міністры адказалі на пытанні парламентарыяў

Учора адбылося сумеснае пасяджэнне палат Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас якога парламентарыі задалі пытанні ўраду. Пра развіццё будаўнічага і транспартнага комплексу, жыллёва-камунальнай гаспадаркі расказаў віцэ-прэм'ер краіны Анатоль СІВАК. На пытанні дэпутатаў і сенатараў таксама адказалі міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА, міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ, старшыня Дзяржкамітэта па маёмасці Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, першы намеснік міністра эканомікі Юрый ЧАБАТАР, намеснік міністра фінансаў Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ, намеснік міністра энергетыкі Вольга ПРУДНІКАВА, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Аляксандр БУРАК.

Павялічыцца колькасць арэндных кватэр

Анатоль Сівак пачаў размову з парламентарыямі з развіцця будаўнічай галіны, у прыватнасці, расказаў пра работу беларускіх будаўнічых арганізацый за межамі краіны, будаўніцтва жылля ў Беларусі, у тым ліку павелічэнне колькасці арэнднага і будаўніцтва кватэр для шматдзетных сем'яў.

— Падраднымі арганізацыямі краіны за 8 месяцаў забяспечана рэнтабельная работа. Чысты прыбытак вырас на 22,3 %, рэнтабельнасць продажаў склала 7,4 %, — расказаў віцэ-прэм'ер. — Аб'ёмы выканання падрадных работ за межамі краіны за 8 месяцаў павялічаны ў два разы, у тым ліку на аб'ектах жыллёвага будаўніцтва — у 1,7 раза. За 7 месяцаў тэмпы экспарту будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг склалі 109,9 %, — прывёў лічбы віцэ-прэм'ер, адзначыўшы, што праведзена работа па актыўным выхадзе беларускіх падрадных арганізацый на рынкі расійскіх рэгіёнаў.

У прыватнасці, зняты абмежаванні па пастаўках у Расію гранітнага шчэбню, падпісаны прагнозныя балансы попыту і прапаноў Саюзнай дзяржавы па цэменце. У выніку за сем месяцаў галіновы экспарт тавараў вырас на 14,6 % і склаў 585 мільёнаў долараў.

Як паведаміў Анатоль Сівак, у Беларусі плануюць значна павялічыць аб'ёмы будаўніцтва арэнднага жылля, у тым ліку для забеспячэння грамадзян, якія маюць патрэбу у ім па месцы работы, ваеннаслужачых і іншых катэгорый. У кастрычніку бягучага года на разгляд кіраўніку дзяржавы ўнесены прапановы аб дадатковай перадачы з рэспубліканскага бюджэту абласцям міжбюджэтных трансфертаў на агульную суму 190 мільёнаў рублёў, у тым ліку на будаўніцтва арэнднага жылля — 86 мільёнаў.

Па плане рэалізуюцца праграма жыллёвага будаўніцтва. Па выніках работы за 9 месяцаў 2022 года ў эксплуатацыю ўведзена 2,8 мільёна кв. м жылля (102,6 % ад плана 9 месяцаў), у тым ліку з дзяржаўнай падтрымкай — 0,9 мільёна кв. м (115 %). Па выніках года ў цэлым па краіне чакаецца выкананне ўстаноўленых гадавых заданняў — 4,2 мільёна кв. м і 1,2 мільёна кв. м з дзяржпадтрымкай.

Сёлета пабудавана 7098 кватэр для 6985 шматдзетных сем'яў (84 % ад гадавога плана), атрымалі накіраванне на паляпшэнне жыллёвых умоў 7617 такіх сем'яў (79 %). Вырашаны пытанні пошуку крыніц ільготнага крэдытавання грамадзян на жыллёвае будаўніцтва.

Капітальны рамонт: з апярэджаннем плана

Аднымі з найбольш вострых і актуальных застаюцца пытанні, звязаныя з правядзеннем капітальнага рамонту: у Беларусі з пачатку года капітальна адрамантавана больш як 2 мільёны кв. м.

— У 2021 годзе капітальна адрамантавана 3 мільёны 344,4 тысячы кв. м жылля, або 2,8 % ад плошчы, якая абслугоўваецца. Гэта самы высокі паказчык за ўвесь час. На 2022 год аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даведзены заданні па капітальным рамонце 3 мільёнаў 620 тысяч кв. м жылля. На дадзены момант адрамантавана і ўведзена ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту 2 мільёны 198,9 тысячы кв. м, што складае 111 % да аналагічнага перыяду 2021 года, — прывёў лічбы намеснік прэм'ер-міністра.

Пры гэтым асобныя рэгіёны заяўляюць аб недахопе фінансавання для выканання ў 2022 годзе даведзеных заданняў па капітальным рамонце жыллёвага фонду. Аднак аналіз праектнай дакументацыі па шэрагу аб'ектаў выявіў нерацыянальнае выкарыстанне сродкаў: праводзіліся работы па мадэрнізацыі, а таксама іншыя работы, не звязаныя з тэхнічным станам канструкцыйных элементаў і інжынерных сетак, неабгрунтавана прымяняліся дарагія матэрыялы, у выніку чаго кошт капітальнага рамонту павялічваўся па асобных аб'ектах на 17—35 %.

З пачатку года ў жылым фондзе заменена 1216 ліфтаў пры гадавым заданні 1490 (летась было заменена 1064). Гэта планамерная работа па замене абсталявання, што адпрацавала нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі. Асноўны аб'ём старых ліфтаў (амаль 10,5 тысячы адзінак) быў заменены ў 2018—2020 гадах.

У рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021 — 2025 гады, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даведзены заданні на бягучы год па рамонце і рэканструкцыі 1454 прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў. Гэта работы па пашырэнні і асфальтаванні праезнай часткі, адналенні пакрыцця пешаходных дарожак, уладкаванні парковачных месцаў, устаноўцы дзіцячых гульнявых комплексаў, рамонце і замене лавак, рамонце, уладкаванні кантэйнерных пляцовак для збору цвёрдых камунальных адходаў. Ужо адрамантавана 1509 прыдамавых тэрыторый, або 103,8 % ад гадавога задання.

Дарогі: фінансаванне павялічана

Анатоль Сівак нагадаў, што рамонт вулічна-дарожнай сеткі населеных пунктаў неабходна завяршыць да 1 лістапада. У бягучым годзе фінансаванне на гэтыя мэты павялічана: дадаткова да прадугледжаных у бюджэтах абласцей 146 мільёнаў перададзены з рэспубліканскага бюджэту міжбюджэтныя трансферты ў агульнай суме 50 мільёнаў. Было запланавана адрамантаваць 3 мільёны 966 тысяч кв. м вулічна-дарожнай сеткі. Таксама ў 2022 годзе прадугледжана выкананне работ па бягучым рамонце 1 мільёна 342 тысяч кв. м вулічна-дарожнай сеткі Мінска.

Пабудавана 48 станцый абезжалезвання

Анатоль Сівак звярнуў увагу на забеспячэнне насельніцтва якаснай пітной вадой.

— Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу па забеспячэнні ў 2025 годзе 100 % спажыўцоў якаснай пітной вадой. У нас па краіне 1763 населеныя пункты маюць пэўныя праблемы. У 2021 годзе пабудавана 201 станцыя абезжалезвання, 50,5 км новых сетак водазабеспячэння, заменена 434 км вадаводаў са звышнарматыўнымі тэрмінамі эксплуатацыі. Перападключаны да існуючых цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння з вадой пітной якасці 12 населеных пунктаў, — расказаў віцэ-прэм'ер.

Паводле яго слоў, на 1 кастрычніка ўведзена ў эксплуатацыю 48 станцый абезжалезвання вады са 150 плановых, па астатніх працягваюцца работы. Заменена 317 км сетак водазабеспячэння са звышнарматыўнымі тэрмінамі эксплуатацыі. Гэта 83,1 % ад гадавога задання. Таксама работы вядуцца далей. Пабудавана 14,8 км новых сетак водазабеспячэння. Уведзена ў эксплуатацыю 5 водазаборных свідравін з 9 запланаваных на год. Перападключаны да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння пітной якасці 7 населеных пунктаў з 12, па астатніх работы выконваюцца.

Дзяржінвестпраграма на 2022 год прадугледжвае 27 мільёнаў рублёў для будаўніцтва станцый абезжалезвання вады, дадаткова на гэтыя мэты мяркуецца накіраваць больш як 57 мільёнаў рублёў.

Для пераводу ў 2025 годзе Мінска цалкам на водазабеспячэнне з падземных крыніц прынята распараджэнне кіраўніка дзяржавы, якое прадугледжвае магчымасць паралельнага праектавання і будаўніцтва, спрашчэнне парадку падрыхтоўчага перыяду будаўніцтва, афармлення дакументаў па адвядзенні зямельных участкаў і іншае. Па выніках 9 месяцаў, узровень забяспечанасці спажыўцоў вадой пітной якасці склаў 96,2 %, а па выніках года чакаецца выкананне мэтавага паказчыка — 96,9 %.

У Мінску з'явіцца новы комплекс па перапрацоўцы адходаў

Да 2024 года плануецца пабудаваць комплекс па перапрацоўцы камунальных адходаў. Яго магутнасць складзе каля 600 тысяч тон у год. Аб'ект уключаны ў інвестыцыйную праграму Мінска.

Цяпер у Беларусі функцыянуюць 7 смеццесартавальных заводаў і 83 лініі сартавання цвёрдых камунальных адходаў агульнай устаноўленай магутнасцю мільён тон у год. У 2021 годзе ўведзены ў эксплуатацыю смеццесартавальны завод у Віцебску магутнасцю 100 тысяч тон у год. Завершана будаўніцтва палігона для захавання адходаў для Брэста.

Як праінфармаваў віцэ-прэм'ер, у бягучай пяцігодцы запланаваны будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю 16 рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў: у Баранавіцкай, Аршанскай і Бабруйскай зонах абслугоўвання, у Гомелі, Пінску, Полацку, Ваўкавыску, Магілёве, Лідзе, Пухавічах, Бярозе, Барысаве, Маладзечне і Салігорску.

У экспарце задзейнічана 14 расійскіх партоў

Распрацаваны альтэрнатыўныя шляхі пастаўкі беларускай прадукцыі на экспарт, расказаў Анатоль Сівак. Цяпер задзейнічана 14 партоў Расіі. Прапрацаваны схемы дастаўкі экспартных беларускіх грузаў праз парты Паўночна-Заходняга рэгіёна Расіі, парты Чорнага і Азоўскага мораў, па сухапутных маршрутах у напрамку Кітая.

Паводле яго слоў, за 9 месяцаў вываз беларускага экспартнага грузу чыгуначным транспартам у парты Расіі павялічыўся ў 2,2 раза да аналагічнага леташняга перыяду. Пры гэтым больш як 34 % пераарыентавана з традыцыйных напрамкаў.

Віцэ-прэм'ер праінфармаваў, што ў верасні бягучага года падпісана міжурадавае пагадненне з Расіяй аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця перавозак асобных відаў грузаў праз транспартныя калідоры, якія праходзяць па тэрыторыі Беларусі і Расіі. Гэта дасць магчымасць забяспечыць альтэрнатыўныя шляхі пастаўкі беларускіх грузаў на экспарт па сухапутным маршруце, а таксама перавалку грузаў у марскіх партах Расіі. Акрамя таго, гарантуе аб'ёмы перавозак прадукцыі экспарцёраў кантэйнернымі цягнікамі транзітам па тэрыторыі Расіі ў Кітай на перыяд да 2024 года.

Увогуле, што датычыцца дастаўкі беларускіх тавараў у Кітай, то тут пабудаваны новыя лагістычныя ланцужкі. Экспартныя перавозкі кантэйнераў з прадукцыяй беларускіх прадпрыемстваў за студзень — верасень склалі каля 83,5 тысячы кантэйнераў. Рост — 4,6 раза да аналагічнага перыяду 2021 года. Усяго за студзень — верасень з Беларусі ў Кітай адпраўлена 690 кантэйнерных цягнікоў.

Станоўчы момант у рабоце транспартнай галіны — аднаўленне аб'ёмаў пасажыраабароту. Калі за 9 месяцаў гэтага года ў параўнанні з леташнім мае месца зніжэнне грузаабароту (74,8 %), экспарту транспартных паслуг (86,7 %), то пасажыраабарот за студзень — верасень 2022 года склаў 15,5 мільярда пасажыра-кіламетраў, або 101,4 % да мінулага перыяду. Назіраецца павелічэнне мабільнасці насельніцтва ў міжнародных зносінах: па аўтамабільным транспарце — у 2,5 раза, чыгуначным — у 1,7 раза.

Інвестыцыйнае развіццё транспартнай галіны не спыняецца, звярнуў увагу віцэ-прэм'ер. Абнаўляецца рухомы састаў: набыты 4 пяцівагонныя электрацягнікі міжрэгіянальных ліній ЭПМ для выкарыстання на маршрутах Мінск — Брэст і Мінск — Гомель, 152 аўтобусы і 19 тралейбусаў для перавозкі пасажыраў транспартам агульнага карыстання. У рамках Нацыянальнага інфраструктурнага плана на 2021—2025 гады прадугледжана рэалізацыя 83 інфраструктурных транспартных праектаў. У 2022 годзе ажыццяўляецца 33 праекты.

Так, сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю мост праз раку Заходняя Дзвіна на пад'ездзе да Наваполацка, абход гарадскога пасёлка Мір, у лістападзе 2022 года адкрыецца рух па аўтамабільнай дарозе «Паўднёва-заходні абход Магілёва».

Добраўпарадкаванне мясцовых дарог і сельскіх могілак

Дэпутаты і сенатары задалі віцэ-прэм'еру і свае пытанні. **Член Савета Рэспублікі Кацярына СЕРАФІНОВІЧ** агучыла пытанне, якое часта ўзнімаецца ў зваротах грамадзян. Маршрутныя аўтобусы не робяць прыпынкаў у невялікіх населеных пунктах і дачных пасёлках, ці можа ўсё ж быць прыпынак па патрабаванні?

— Мы прапрацуем дадзенае пытанне, хоць я разумею, з якім супраціўленнем сутыкнёмся па выспецы руху і арганізацыі прыпыначных пунктаў. Не павінна быць так, што праз 10 метраў каля наступнага дома аўтобус зноў спыняецца. Але мы разгледзім згаданае пытанне, — адзначыў Анатоль Сівак.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА дадала, што варта ўдасканаліць работу і чыгуначнага транспарту:

— Дзесьці скарацілі прыпынкі, адмянілі маршруты, а людзі, часта пенсіянтаў ўзросту, едуць на дачу, на работу. Такое пытанне таксама варта паглядзець.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей СЫРАНКОЎ таксама агучыў набалелае для сваіх выбаршчыкаў. Плануецца рэканструкцыя моста праз Сож у Чэрыкаве, пры гэтым аб'язныя шляхі, якія прапануюцца, не задавальняюць мясцовых жыхароў. Адна з прапанаваных дарог Р-140 на 25 км мае гравійнае пакрыццё. Анатоль Сівак паабяцаў, што перад закрыццём моста на дарозе будзе пакладзены асфальт.

Сенатар Таццяна РУНЕЦ пацікавілася ў міністра архітэктуры і будаўніцтва Руслана Пархамовіча, як прыцягнуць да адказнасці тыя структуры, якія мусяць назіраць за якасцю будаўніцтва новага жылля. Нярэдка пасля яго здачы ў жыльцоў узнікаюць самыя розныя праблемы. З сенатарам пагадзіліся спікеры палат Наталля Качанава і Уладзімір Андрэйчанка і папрасілі міністра прапрацаваць неабходныя змяненні ў новы Жыллёвы кодэкс, праект якога разглядаецца.

Член Савета Рэспублікі Валерый ГАЙДУКЕВІЧ спытаў у міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэя Хмеля, як пасля перадачы сельскіх могілак у распараджэнне структуры ЖКГ будзе вырашацца пытанне са сплоўваннем старых дрэў. Міністр паабяцаў, што праблем не ўзнікне: у арганізацыях маюцца неабходныя спецыялісты і праблема будзе вырашацца.

Алена КРАВЕЦ.

Правы чалавека, мытныя пошліны і паштовыя адпраўленні

Сенатары адобрылі шэраг паправак у законапраекты

У Савеце Рэспублікі падчас дзясятай сесіі сёмага склікання былі разгледжаны пытанні, якія датычыліся выплаты мытных пошлін, паштовай канвенцыі і міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Быў ратыфікаваны праект закона аб правядзенні сумесных кантрольных мерапрыемстваў па пытаннях захавання парадку залічэння і размеркавання сум увазных мытных пошлін. Як адзначыў **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Андрэй ЛАБОВІЧ,** новаўвядзенне будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці ўвазных пошлін. Механізм размеркавання пошлін і кантроль за імі дазволіць атрымліваць дадатковы даход у бюджэт.

Сенатарамі быў разгледжаны таксама законапраект аб «Аб дэнансацыі Рэспублікай Беларусь Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах». Гэты законапраект разглядаецца з улікам правапрымяняльнай практыкі і самавольнага пашырэння Камітэтам ААН па правах чалавека сваіх паўнамоцтваў, якія стварылі дадатковыя неабгрунтаваныя абавязацельствы для нашай краіны.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ адзначыў, што падрыхтоўка дадзенага законапраекта звязана з аналізам правапрымяняльнай практыкі дакумента і самавольнай трактоўкі Камітэтам па правах чалавека ААН сваіх паўнамоцтваў:

— Мы лічым, што камітэт выйшаў за тыя функцыянальныя абавязкі, якія апісаны ў дакументе. Беларусь заўсёды выконвала ўсе свае міжнародныя абавязацельствы ў сферы правоў чалавека. Мы штогод прадстаўляем адпаведныя дакументы ў Савет па правах чалавека ААН. Заўсёды падтрымлівалі не толькі ідэі, але і сам механізм прадстаўлення ўніверсальнай справаздачы па правах чалавека. Мы заўсёды вельмі старанна рыхтавалі сваю справаздачу, прадстаўлялі яе на добраахвотнай аснове. Заўсёды выслухоўвалі ўсе заўвагі і рэкамендацыі, якія выказваліся членамі Савета па правах чалавека ААН, і прымалі адпаведныя дакументы па рэалізацыі тых рэкамендацый, з якімі Беларусь была згодна. І мы вельмі старанна рэалізоўвалі ўсе гэтыя рэкамендацыі. Мы рабілі розныя дзеянні для таго, каб знайсці ўзаемапрымальнае рашэнне, але нас не чуюць. Таму Беларусь прымае рашэнне аб дэнансацыі гэтага факультатыўнага пратакола. Але мы не збіраемся спыняць удзел у міжнародным супрацоўніцтве па тэматыцы правоў чалавека, — падсумаваў Сяргей Рачкоў.

Акрамя таго, на сесіі быў разгледжаны праект «Аб ратыфікацыі Адзінаццатага дадатковага пратакола да Статута Сусветнага паштовага саюза, Трэцяга дадатковага пратакола да Агульнага рэгламента Сусветнага паштовага саюза, Сусветнай паштовай канвенцыі і Пагаднення аб паштовых плацежных паслугах і Заключнага пратакола Пагаднення аб паштовых плацежных паслугах». Прыняты законапраект накіраваны на развіццё транзітных паштовых адпраўленняў праз тэрыторыі іншых краін, аптымізацыю паштовых плацежных паслуг і ўдасканаленне знешнеэканамічнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца аператарамі сувязі.

Арына КАРПОВІЧ.

Па сутнасці

БАЦЬКАЎ ЧАС

Давайце паглядзім, хто цяпер на палітычным алімпе. Хто заўгодна. Пацешныя дзядулі-фрыкі, інфантыльныя прынцы-перакоснікі, на палітычнай авансцэне нават былыя комікі, топ-менеджары, бізнесмены, дзеці карнікаў. Відавочна не хапае мужчынскага архетыпа. Гаспадара. Сучасная заходняя дэмакратыя не прымае такіх асоб. Для іх нават абразлівую мянушку прыдумалі — цысгендар. А насамрэч гэта — сапраўдны мужчына. Гаспадар. Бацька. Той, хто не шкадуе сябе дзеля справы, можа прыняць рашэнне і нясе за яго адказнасць. Ён можа быць і строгім выхавальнікам, і цярплівым дарадцам.

Бацька ніколі не будзе саромецца сваіх дзяцей. Нават брудных і ў слязах. Заўжды дапаможа паставіць іх на ногі, адправіць у жыццё. І нават для дарослых знойдзе трапнае слова, дасць патрэбную параду. Такога бацьку паважаюць не за сілу. За яго мудрасць.

Бацька. Ён і дом пабудуе, і ў полі рупліва будзе працаваць. Сваю родную хату ніколі не дасць ператварыць у «раскіданае гняздо» — як можна? І поле не дасць дзяліць на цераспалосіцу. Як гэта, яно ж роднае — сваё. Калі дзіця будзе шкодзіць, то бацька і папругу можа дастаць. А калі дзіця спатрэбіцца абараняць, то і стрэльбу. Вы, напэўна, зразумелі паралелі.

Ну які бацька будзе лупцаваць сваіх дзяцей? Не пагодзіцца «неверагодная» частка грамадства, зразумеўшы паралелі. Яшчэ і крытыкуем. За што? За тое, што трохі за вушы пацягалі... Але калі б не супакоілі буйны натоўп, было б горш, чым у паўднёвых суседзяў.

Ну, з кім параўноўваеш, залямантуе чытач. Ты, маўляў, з сапраўднай Еўропай пацягайся. Дык вось Украіна пайшла ў Еўропу праз плошчу з лозунгамі «цэ Еўропа». А трапіла ў пастку... Бо прэзідэнты ў яе былі, а бацькі — не было. Не было каму спыніць ашалелых нашчадкаў. Выхаваў Захад. А што да еўрапейскіх прэзідэнтаў, як раней любілі казаць, наёмных менеджараў, дык яны і паводзяць сябе як наёмнікі.

У ковід — паслухалі дарад калектыўнага «нечага». Прадпрыемствы і храмы пазачынялі. Людзей — пад хатні арышт. Коньмі разганялі. І ніхто з кіраўнікоў заходніх краін не паказаў сябе гаспадаром у сваёй дзяржаве. Ніхто. Вось і атрымліваецца, што яны не палітыкі, а паслухмяныя наёмнікі. Лукашэнка таксама паступіў не як палітык. Як палітык — гэта падстройвацца пад меркаванне большасці. Хай сабе дылетанцкае меркаванне, хай сабе меркаванне запраграмаванага праторай «Тэлеграма». Лукашэнка паступіў тады як бацька, які ведае, як дзецям лепш. Успомніце сябе — колькі крыўдзіліся на бацькоў за непапулярныя, як тады здавалася, меры, а цяпер — дзякуем. Так і з рашэннямі падчас пандэміі. Дарэчы, толькі бацька пойдзе да сваіх дзяцей нават у самую «чырвоную зону».

Вось калі Лукашэнка не пагадзіўся на сорасаўскія эксперыменты гендарнага кшталту, на фінансавыя пературбацыі вялікага рынку МВФ, на рэформы «ельцыноідаў», на прыхватызацыю земляў і заводаў «чубайцамі», то адразу для ворагаў стаў «апошнім дыктатарам Еўропы», затое для беларусаў — Бацькам.

І яшчэ. Бацька з аўтаматам. Казаў і буду казаць. Ён выйшаў не супраць галоў, перагрэтых гарачкай паліттэхналогій, ён выйшаў супраць тых, хто цяпер ужо адкрыта, не саромеючыся, рухаецца «нах остэн». У Крэмль, потым на Пекін. А найкарацейшы шлях — праз наш Палац Незалежнасці.

Ды і ўвогуле, хто з палітыкаў такой велічыні будзе хвалявацца за новыя рынкі продажу, цікавіцца коштам капусты, нават складам цукерак. А яшчэ — бальніцамі, якасцю бронекамізэлек, лёсам асірацелых старых і дзяцей усёй краіны. Хто з так званых легітымных такую ўвагу аддае падтрымцы мацярынства і дзяцінства. Наадварот — там такое прапагандуюць і навязваюць, што нават брыдка пісаць на старонках сур'ёзнага выдання.

Беларускі кіраўнік — паўсюдна — Бацька. І ганебнага, і абразлівага ў гэтым няма нічога. «Во, Бацька прыляцеў». «Во, Бацька выступае!» «Ну ваш Бацька ўчора даў, не сунуцца». Гэта гучыць з розным акцэнтам, але ж аднолькава — з павагай у голасе. Сярод усяго гэтага палітэсу — адшліфаванага, паказальна-дыпламатычнага — людзям не хапае сапраўднага лідара. Які, як бацька за сямейным сталом, і кулаком можа стукнуць, і праўду сказаць. Вінаваты — адказвай. Нельга шкодзіць альбо паскудзіць.

З самых вялікіх і знакавых самітаў Лукашэнка заўжды вяртаецца ў родную Хату. На малую радзіму і ўвогуле на Радзіму. І хай тая хата не ўзнімаецца да нябёсаў, хай яна сціплая. Але яна свая. Пабудаваная мазолістымі рукамі Бацькі. Каб засяваць бацькава поле. А калі патрэбна, то і абараняць Бацькаўшчыну. Нягледзячы на кпіны і насмешкі, на незадаволены настрой. Але час і жыццё ўсё расстаўляюць па сваіх месцах. Заўжды аказваецца, што бацькі мелі рацыю.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Абмяркуем

«Кожны з бацькоў павінен быць педагогам»

Такую думку выказаў падчас рэспубліканскага семінара, што прайшоў на базе БДПУ, міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ. У цэнтры ўвагі яго ўдзельнікаў аказаўся Рэспубліканскі сацыяльна-адукацыйны праект «Бацькоўскі ўніверсітэт», які рэалізоўваецца з 2020/2021 навучальнага года.

Адкрываючы семінар, Андрэй Іванец падкрэсліў, што сям'я непараўнальная па сваёй значнасці ні з якімі іншымі сацыяльнымі інстытутамі. Яна адыгрывае важную ролю ў жыцці дзяржавы, у выхаванні новых пакаленняў і ў забеспячэнні грамадскай стабільнасці і прагрэсу. Распрацаваны два метадычныя дапаможнікі для бацькоў, якія могуць выкарыстоўвацца для таго, каб выбудоўваць узаемаадносіны ў сістэме «бацькі — дзіця — установы адукацыі»

Міністр адукацыі нагадаў, што ў школах з гэтага навучальнага года кожная чацвёртая субота месяца прысвечана рэалізацыі праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт»: «У мінулым годзе на педагагічным савеце кіраўнік дзяржавы даў даручэнне рэалізоўваць гэты праект па ўсёй краіне. Мы цудоўна разумеем, што ролю сям'і ў выхаванні моладзі вельмі складана пераацаніць, таму павінны стварыць усе ўмовы для таго, каб даць бацькам неабходныя педагагічныя, псіхалагічныя і іншыя навыкі для правільнага выхавання. Для іх распрацаваны два метадычныя дапаможнікі. Гаворачы пра выхаванне, мы маем на ўвазе ўсе аспекты: псіхалагічны, маральны, духоўны. Таму сёння ў нашым семінары бяруць удзел не толькі педагогі, якія працуюць на месцах, але і прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы».

Старшыня Сінадальнага аддзела па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ расказаў аб новых падыходах па ўзаемадзеянні Беларускай праваслаўнай царквы з установамі адукацыі ў пытаннях фарміравання адказнага бацькоўства і падзяліўся сваім бачаннем гэтага пытання. «Трэба больш кантактаваць з дзецьмі, — параіў ён. — Здараецца, што менавіта слова можа стаць выратавальнай саломінкай. Працэс стасункаў паміж дзецьмі і бацькамі рэгулюецца не толькі метадычнымі рэкамендацыямі, а сэрцам, якое любіць».

На семінары былі абмеркаваны пытанні ўдасканалення дзейнасці «Бацькоўскіх універсітэтаў». Прагучаў найлепшы вопыт работы школ краіны па фарміраванні псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША стварылі гібрыдны варыянт каранавіруса са смяротнасцю 80 %

Спецыялісты з Бостанскага ўніверсітэта (штат Масачусетс, ЗША) стварылі гібрыдны варыянт COVID-19, які спалучае ў сабе «Амікрон» і арыгінальны штам з кітайскага горада Ухань. Смяротнасць пры новым вірусе складае 80 %. Аб гэтым піша газета Daily Mail.

Эксперыменты на мышах паказалі, што ў новага варыянта COVID-19, створанага ў лабараторыі ўніверсітэта, лятальнасць складае 80 %. У той жа час у групе мышэй, якая была заражана звычайным «Амікронам», не памёр ніводны грызун.

Даследаванне вучоных з Бостанскага ўніверсітэта выклікала шквал крытыкі ў навуковых колах ва ўсім свеце. Спецыялісты з розных краін звярнулі ўвагу на тое, што «такія эксперыменты — гэта гульня з агнём», бо яны «могуць справакаваць новую пандэмію, створаную ў лабараторыі».

Выданне піша, што адкрыццё паказвае, наколькі небяспечна тое, што даследаванні з маніпуляваннем вірусамі працягваюцца і ў ЗША, нягледзячы на асцярогі, што падобныя метады маглі справакаваць пандэмію.

Большасць спецыялістаў упэўненая, што такія даследаванні павінны быць катэгарычна забароненыя.

У Германіі пачасціліся выпадкі крадзяжу драўніны з-за росту цэн на энерганосьбіты

Высокія цэны на энерганосьбіты і дэфіцыт дроў прывялі да таго, што ў лясах Германіі сталі часцей красці драўніну. Пра гэта ўчора паведаміў партал навін Tagesschau.



«У сувязі з нядаўнім ростам цэн на энерганосьбіты дровы і іх выкарыстанне перажылі своеасаблівы рэнесанс. Многія рытэйлеры пастаўляюць гэты тавар толькі для сваіх пастаянных кліентаў, цэны працягваюць расці», — адзначаецца ў матэрыяле.

Указваецца, што ў 2021 годзе кошт кубаметра суцэльнай драўніны складаў каля €60-70, а цяпер цана — каля €200.

Таксама прадстаўнік рэгіянальнага ляснога дэпартамента Мюнстэра Адальберт Кох расказаў, што вывад драўніны незаконны, і тыя, хто крадзе драўніну, падлягаюць крымінальнаму праследаванню.

У дзяржаўным прадпрыемстве «Лес і лесаматэрыялы» ў зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія выявілі крадзеж у прамысловых маштабах.

Былі таксама выяўлены асобныя прафесійныя зладзеі, якія зганялі цэлыя грузавікі з лесу, паведамілі там.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Шаўчуку Мікалаю Мікалаевічу, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Пра сваю пенсію паклапаціцеся загадзя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Заява можа быць накіравана па пошце, але ў такім выпадку подпіс на заяве і прыкладзеныя да яе копіі дакументаў, акрамя копіі дакумента, які сведчыць асобу, павінны быць натарыяльна завераны.

КАЛІ ПАДАВАЦЬ ЗАЯВУ

Права на працоўную пенсію па ўзросце ўзнікае ў дзень нараджэння. Раней заяву прымуць толькі ў тым выпадку, калі ён выпадае на выхадныя ці святочныя дні.

Да заявы трэба прыкласці неабходныя дакументы. Спецыяліст правярыць іх, і калі не хапае нейкіх дакументаў або яны няправільна аформлены, то даецца месяц на дапрацоўку. Калі заяўнік паспявае ў гэты тэрмін, датай звароту па пенсію будзе лічыцца дзень прыёму заявы.

Аднак у ідэале за паўгода да наступлення пенсіённага ўзросту рацыянальна будзе пракансультавацца ва ўпраўленні па працы і сацабароне, а таксама можна звярнуцца ў кансультацыйна-аналітычны аддзел Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

ПАКЕТ ДАКУМЕНТАЎ

Да заявы аб прызначэнні пенсіі трэба прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць працоўны стаж: працоўную кніжку, пасведчанні аб нараджэнні дзяцей, ваенны білет, дакументы аб адукацыі, атрыманай на дзённай форме навучання ў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў, а таксама ў аспірантуры, клінічнай ардынатуры, дактарантуры, даведку аб перыядзе атрымання дапамогі па беспрацоўі і г. д.

Для тых, каму прызначаюць пенсію сёлета, неабходна прадставіць даведкі аб заробку за апошнія 28 гадоў запар стажу работы, для тых, хто выйдзе на пенсію ў 2023 годзе, — за 29 гадоў. Таксама трэба прадставіць пашпарт і страхавое пасведчанне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання — зялёную пластыкавую картку.

ЗВЕСТКІ АБ ЗАРПЛАЦЕ І СТАЖЫ: ЯК ІХ АТРЫМАЦЬ

Працоўная кніжка — асноўны, але не адзіны дакумент, які пацвярджае працоўны стаж. Стаж да 31 чэрвеня 1998 года ўключна залічваецца нават у выпадку, калі заробак не пацверджаны. З 1 ліпеня 1998 года да 2003 года, апроч працоўнай кніжкі, патрэбная яшчэ даведка аб зарплаце з адлічэннямі ў ФСАН. Гэта якраз той перыяд, калі фірмы хутка адкрываліся і закрываліся, дакументы ў архіў не здаваліся, ды і заробак далёка не заўсёды быў «белы». Тым не менш, калі арганізацыя або яе праваперамнік дзейнічае, да іх і трэба звяртацца па даведку аб зарплаце. **Калі арганізацыя ліквідавана, то накіроўваюцца запыты ў дзяржрэгістр і дзяржархіў.** Таксама варта звярнуцца ў кансультацыйна-аналітычны аддзел Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН з лістом, у якім трэба пазначыць перыяд работы, найменне арганізацыі, юрыдычны адрас на момант працоўнай дзейнасці. На працягу месяца з гэтай структуры прыйдзе адказ, з якога будзе зразумела, ці плаціла арганізацыя ўзносы ў ФСАН. Калі выплачвала, тады трэба звяртацца ў суд для ўстанаўлення памеру заробку. Узор заявы можна спампаваць на сайтах судоў. У адпаведнасці з заканадаўствам заяўнік вызваляецца ад выплаты дзяржпошліны пры разглядзе заяў аб устанаўленні факта атрымання заработнай платы. У суд неабходна падаць адказы з архіва, ФСАН, даведку аб ліквідацыі арганізацыі. Суд прымае да разгляду любыя захаваныя дакументы: разліковыя лісткі, загады, працоўныя дагаворы, сведчанні былых калег.

Рашэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу, аб устанаўленні факта атрымання заробку прымаецца для назначэння або перараслiку пенсіі.

За перыяд пасля 1 студзеня 2003 года даведкі непатрэбныя, бо ўсе звесткі аб «белых» заробках адлюстраваны ў персаніфікаваным уліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Зразумела, што заробкі ў «канверце» пры налічэнні пенсіі не ўлічваюцца.

СТРАХАВЫ СТАЖ

Для тых, хто выходзіць на пенсію сёлета, неабходна 18,5 года страхавога стажу, у 2023-м — на паўгода больш. **Як і ў выпадку з працоўным стажам, перыяд работы да 31 чэрвеня 1998 года ўключаецца ў страхавы стаж безумоўна.**

Даведацца, ці плаціў наймальнік страхавыя ўзносы за перыяд з 1 ліпеня 1998-га да 31 снежня 2002 года, як ужо адзначалася, можна праз кансультацыйна-аналітычны аддзел Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН, які дае такія звесткі незалежна ад тэрытарыяльнай прыналежнасці заяўніка.

Трэба ўлічваць, што страхавы стаж не заўсёды супадае з працоўным. Напрыклад, догляд састарэлага, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту і мае патрэбу па заключэнні дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя ў пастаянным доглядзе, што ажыццяўляецца працаздольнай асобай, у агульны працоўны стаж уключаецца, а ў страхавы — не.

ПАДВЯДЗЁМ ВЫНІКІ

Цяпер выходзіць на пенсію пакаленне, якое паспела папрацаваць у часы СССР і неабавязкова на тэрыторыі нашай краіны. Аб цяжкасцях з дакументамі ў «ліхія 90-я» мы ўжо згадвалі. А колькі яшчэ розных нюансаў, напрыклад работа па сумяшчальніцтве ці на палову стаўкі... Сітуацыя кожнага чалавека адрозніваецца ад іншага. Вось таму настойліва раім загадзя пракансультавацца са спецыялістамі, прычым з працоўнай кніжкай або яе копіяй у руках. Нават калі падрыхтоўкай дакументаў будзе займацца кадравая служба, лепш, як той казаў, трымаць руку на пульсе, бо няма больш зацікаўленага чалавека ў скрупулёзным уліку стажу і заробку, чым сам будучы пенсіянер.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Беражыце дзяцей!

ХВІЛІНА, ЯКУЮ НЕ ВЕРНЕШ...

Што вядома аб здарэнні ў Светлагорску, дзе маленькі хлопчык выжыў пасля падзення з 9-га паверха

Медыкі Светлагорскай цэнтральнай раённай бальніцы аказваюць усю неабходную медыцынскую дапамогу двухгадоваму пацыенту, які выпаў з акна шматпавярховіка. Такая інфармацыя на раніцу 19 кастрычніка.

Па інфармацыі Галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Гомельскага аблвыканкама, у Светлагорскай ЦРБ праведзены кансіліум з удзелам спецыялістаў Гомельскай абласной дзіцячай бальніцы: хірурга, траўматолага, нейрахірурга, рэаніматолага. Узгоднена лячэнне пацыента. Хлопчык атрымаў цяжкую чэрапна-мазгавую траўму, але прагноз для жыцця спрыяльны.

Надзвычайнае здарэнне адбылося 18 кастрычніка ў доме па вуліцы Стэфаноўскага. Прыкладна а палове адзінаццатай раніцы з акна кватэры на апошнім, дзявятым, паверсе выпала дзіця.

Па паведамленнях «Светлагорскіх навін», камеры відэаназірання, устаноўленыя на суседніх дамах, зафіксавалі момант падзення хлопчыка, а таксама тое, што ён спачатку ляжаў, потым спрабаваў варушыцца. Відавочцы тут жа падбеглі да малога, выклікалі медыкаў. Дзіця даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне цэнтральнай райбальніцы. Цяпер усе, хто ведае пра гэту гісторыю, перажываюць за дзіця і жадаюць яму поўнага выздараўлення.

Супрацоўнікамі Светлагорскага раённага аддзела Следчага камітэта па дадзеным факце распачата праверка. Высвятляюцца абставіны і прычыны здарэння.

— Паводле папярэдняй інфармацыі, двухгадовы хлопчык і яго сястра знаходзіліся ў кватэры разам з маці. Калі жанчына на пэўны час выйшла да суседкі, сын залез на падаконнік і выпаў з акна, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА.**

Праваахоўнікі нагадваюць: менавіта дзеці ад двух да пяці гадоў часцей за ўсё трапляюць у такія сітуацыі і ў 70 працэнтах выпадкаў надзвычайнае здарэнне адбываецца альбо на вачах у бацькоў, альбо на працягу першых 15 хвілін пасля таго, як малыя застаюцца без нагляду дарослых.

На Гомельшчыне з пачатку года гэта ўжо не першы падобны выпадак. Прайшло амаль чатыры месяцы, а для відавочцаў аналагічнай гісторыі ў Гомелі той дзень назаўсёды застанецца ў памяці. Проста на вачах суседзяў аднаго са шматпавярховікаў па вуліцы Мазурава з акна пятага паверха выпала пяцігадовая дзяўчынка. Малая ўпала з 15-метровай вышыні на бетонную пліту. Дзіця выжыла. Пасля правядзення некалькіх аперацый, маленькую пацыентку яшчэ 12 дзён літаральна выцягвалі з таго свету гомельскія медыкі. На шчасце, дзяўчынка ўжо праз месяц пасля здарэння пачала выздараўліваць. Родныя дзіцяці рыхтаваліся да доўгай рэабілітацыі малой.

У тым, што ў небяспечныя гульні, якія ў адно імгненне могуць скончыцца падзеннем з вышыні і гібеллю, могуць гуляць дзеці ўсіх узростаў, днямі пераканаў падлетак з Гомеля. На мінулым тыдні жахлівае відэа са школьнікам, які гуляў па парапеце даху дзевяціпавярховіка, ускалыхнула сацыяльныя сеткі. Пры гэтым зваротаў у міліцыю аб дадзеным выпадку ад відавочцаў не паступала. Пра тое, што сын разгульваў па парапеце, маці дзевяцікласніка даведалася выпадкова. Адрэагавалі на здарэнне супрацоўнікі Камісіі па справах непаўналетніх Чыгуначнага раёна Гомеля. Як высветлілася, падлетак выхоўваецца ў сям' і, якая вельмі добра характарызуецца. І родныя хлопца, і яго педагогі адзначылі — яны ніколі не маглі ўявіць, што падлетак можа зрабіць такі неабдуманы ўчынак.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

На слыху

Паляўнічы падстрэліў свайго кума

Трагічны выпадак адбыўся ў мінулую нядзелю паблізу вёскі Краўцоўка ў Цярухскім лясніцтве Гомельскага раёна. Замест меркаванага лася паляўнічы трапіў у шыю 33-гадоваму мужчыну, свайму куму. Сіротамі засталіся двое малалетніх дзяцей. Падрабязнасці здарэння паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама.

У суботу старшы егер абласной арганізацыйнай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў сабраў каманду з дзевяці чалавек для загоннага палявання на лася. Раніцай наступнага дня ў лясным масіве правёў належны ў такіх выпадках інструктаж аб тэхніцы бяспекі, афармiў неабходныя дакументы. Удзел у паляванні павінен быў узяць і 38-гадовы індывідуальны прадпрымальнік з Гомеля.

Аднак да вызначанага часу ён не з'явіўся, а перазваніў егеру і паведаміў, што спазняецца. Адказ таго быў кароткі — брыгада да палявання гатовая і чакаць не будзе.

Напярэдадні вечарам мужчына ўжываў спіртное, таму за руль асабістага УАЗа пасадзіў свайго кума. Прыехаўшы да месца правядзення палявання кіламетра за паўтара, пачуў, што сабакі ўзялі след жывёліны. Паляўнічы вырашыў самастойна, без допуску да вядзення палявання, устаць на лінію агню. Для гэтага пешшу рушыў на шум. Куму ж сказаў ехаць следам. Пазней загадаў спыніцца і чакаць, а сам накіраваўся на брэх сабак. Кіроўца вырашыў прайсціся па лесе.

Неўзабаве паляўнічыя пачулі чатыры выстралы, а крыху пазней адзін з іх знайшоў у лесе труп чалавека з агнястрэльным раненнем у шыю. Егер тут жа сабраў удзельнікаў палявання, але аказалася, што ніхто з іх не страляў. Засваніліся з тым, хто спазніўся, аказалася, што стрэлы зрабіў менавіта ён.

Як расказаў мужчына, ён пачуў шум у лесе і варушэнне кустоў. Не пераканаўшыся, што гэта жывёліна, наўгад разрадзіў дублетам стрэльбу. Перазарадзіўся і паўторна зрабіў два выстралы. Адна з куль аказалася смяротнай.

Следчымі ў дачыненні да гараджаніна заведзена крымінальная справа па факце прычынення смерці па неасцярожнасці.

Хацеў «затэсціць» міні-трактар

У дзяжурную часць Маларыцкага РАУС звярнулася жыхарка вёскі Макраны і паведаміла аб тым, што ноччу невядомы перамясціў яе міні-трактар.

Падчас правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў сышчыкі райаддзела ўстанавілі абставіны здарэння.

Як аказалася, 24-гадовы жыхар суседняй вёскі, будучы ў стане алкагольнага ап'янення, прыйшоў у госці да сваіх знаёмых. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, убачыўшы незвычайны транспартны сродак, маладому чалавеку захацелася пракаціцца на ім, аднак самастойна завесці міні-трактар не атрымалася. Для пуску рухавіка вясковец зрабіў некалькі спроб: наматаў вяроўку на шкіў рухавіка, штурхаў транспартны сродак уручную. Завесці трактар так і не ўдалося. На падазраванага завялі крымінальную справу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сямейная газета

Выпуск № 17 (199)

ТАКІЯ РОЗНЫЯ ТАТЫ

Апошнія 12 гадоў Аліна жыла разам з бацькам. Рана аўдавела, дзеці выраслі і, стварыўшы ўласныя сем'і, раз'ехаліся па розных гарадах. Вось і забрала старога з вёскі ў горад, каб і самой не сумна было, і бацьку як належыць дагледзець.

Ён, прызнацца, быў з характарам. Не любіў, каб дачка дзесьці затрымлівалася. Нярэдка нават паход у краму станавіўся прычынай для гневу. Не кажучы ўжо пра сустрэчы з сяброўкамі, візіты ў госці з нагоды дня нараджэння кагосьці з членаў сям'і і нават паездкі да дзяцей. Бацька хацеў, каб дачка была заўсёды пры ім. Прычым менавіта яна, малодшая, хоць і старэйшая часта прыходзіла, бо жыве ў суседнім доме.

Калі ж бацька адчуваў недамаганне, то Аліне свет быў нямілы. Ён мог уключыць пасярод ночы ў яе пакоі святло і папрасіць, каб памерала яму ціск, мог увогуле ляжаць, не гаворачы пры гэтым, што яму баліць. Аліна, трэба сказаць, стаяла над ім і дзень, і ноч. У дні бацькавага недамагання не ела, не спала, хоць і сама ўжо немаладая і не зусім здаровая — больш клапатлівай і ўважлівай дачкі мала дзе знойдзеш. Аднак бацька ўвесь час быў нечым незадаволены: то есці яму не тое далі, то ціск несвоечасова памералі, то таблетку не гэтую прапанавалі — інакш чаму не дапамагае!? А, між іншым, дзядулю дзясяты дзясятак пайшоў.

Калі ўжо не магла справіцца, яна, медыцынскі супрацоўнік, клала бацьку ў бальніцу, дзе за ім, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, ажыццяўляўся вельмі годны догляд. Так было і тым разам. Справіцца з высокім ціскам і ацёкамі ног у хатніх умовах яна не здолела — паклала бацьку ў бальніцу. Адтуль ён ужо не выйшаў...

Чорная ад гора была Аліна ў тыя дні. Добра разумела, што бацькаў век быў немалы — памёр праз некалькі тыдняў пасля свайго 95-годдзя. Аднак сваіх шкадуеш у любым узросце. Думала, што горш за смерць маці нічога не бывае. Памылялася... Вінаваціла сябе, што некалі нешта не так сказала, не тое зрабіла, не дагадзіла яму. Пасля страты бацькі ў ёй нешта патухла. Родны чалавек, аб якім яна кожны дзень клапацілася, да якога хутчэй ляцела з работы, больш не чакаў яе дома, не пільнаваў у акне, як гэта часта бывала. Яна стала прыходзіць у пустую кватэру, дзе, акрамя кошкі, больш нікога не было. Толькі пасля смерці бацькі Аліна зразумела, якое месца ён займаў у яе сэрцы.

Розныя бываюць бацькі. Адны не прызнаюць сваіх дзяцей, іншыя і чужых выхоўваюць як родных. Аднак усім дзецям без выключэння патрэбен бацька, хоць, вядома, не кожны мае такую раскошу. Мне пашанцавала выхоўвацца ў поўнай сям'і. Як муж, тата, можа, быў і не ідэальны, як бацька — іншага і не трэба. Помню, як доўгімі зімовымі вечарамі мы з ім вывучалі «жыхароў» Чырвонай кнігі, гулялі ў шашкі, а раніцай каталіся на лыжах ды санках. Нярэдка мы з братам шукалі заступніцтва ў бацькі: ён заўсёды быў на нашым баку, калі маці сварылася на нас. Заўжды падтрымліваў, не ўмешваўся ў прынятыя рашэнні і вельмі раскрыўся з нараджэннем унука.

У майго сына самы лепшы не толькі дзядуля, але і бацька. У выхаванні дзіцяці ў нас з мужам няма «яго» абавязкаў і «маіх». Я поўнасцю давяраю Арцемія мужу, калі з'язджаю на некалькі дзён у камандзіроўкі, нярэдка пакідаю на бацьку хлопчыка і тады, калі малы хварэе. Ведаю, што і лекі своечасова дасць, і пакормiць, і спаць пакладзе. А яшчэ ёсць менавіта бацькавы функцыі. У тры гады мой сын ужо ганяў на двухколавым веласіпедзе — не ведаю, колькі часу мне давялося б патраціць дзеля такога выніку. Ды і ці хапіла б цярпення?! Яшчэ яны разам наведваюць цырульню, ходзяць у лазню, косяць траву (малы зграбае яе ў кучы), Дзіма нярэдка бярэ Цёміка з сабой і тады, калі едзе рамантаваць або мыць машыну, — адным словам, яны разам робяць чыста мужчынскія справы, у якія жанчынам не варта сунуць нос. І як бы хто ні казаў, што маму замяніць нельга (гэта, вядома, ісціна), але і бацьку замяніць немагчыма. І дай бог, каб такія пытанні ўвогуле не ўзнікалі.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

«Добры прыклад яшчэ нікому не нашкодзіў»

Гутарку з Сяргеем МЯРЖВІНСКІМ — настаўнікам гісторыі, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце школы № 47 горада Віцебска — пачынаем з яго любімага анекдота. Сын пытае ў маці: «Што ты хочаш на Новы год?» — «Новае футра», — адказвае тая. — «А тата табе падарыць?» — «На жаль, не, яно дорага каштуе». — «А ты спрабавала на падлогу кідацца і моцна крычаць?»... Многія бацькі гатовыя выканаць любы капрыз дзіцяці — абы яно змоўкла і стала ціха. У Сяргея як педагога на гэты конт зусім іншая прынцыповая пазіцыя. Кажа, не памятае такога, каб дзеці (іх у Сяргея пакуль двое — шасцікласніца Ганна і другакласнік Андрэй) — білі ся на падлозе ў істэрыцы. Бо любая спроба маніпуляцыі спынялася адразу ж, на корані. Сёння, напярэдадні Дня таты, Сяргей Леанардавіч падзяліўся з нашымі чытачамі дзейснымі сакрэтамі выхавання.

Пра трамвай, афрыканскіх смаўжоў і абдымкі

— Што вы рабілі ў тыя дні, калі нараджаліся вашы дзеці?

— Пра нараджэнне дачкі я даведаўся, калі ехаў у трамваі з працы дадому. Вельмі ўзрадаваўся! Адразу ж паехаў да сваіх бацькоў, мы з імі разам адзначылі гэту цудоўную падзею. Калі жонка нараджала сына, я быў дома з дачкой. Памятаю, ніяк не маглі выбраць яму імя. Цэлы дзень вёў перамовы па тэлефоне з жонкай, бацькамі, сябрамі. Урэшце мой тата прапанаваў назваць сына Андрэем, мы гэты варыянт нават не разглядалі — але ён адразу ж спадабаўся і мне, і жонцы.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Святу — быць!

ДЗЕНЬ БАЦЬКІ ЗАВЕРШЫЦЬ ТЫДЗЕНЬ БАЦЬКОЎСКАЙ ЛЮБОВІ

21 кастрычніка ў Беларусі ўпершыню адзначаць Дзень бацькі. Першы раз сёлета ў краіне праводзіцца і Тыдзень бацькоўскай любові. Пачаўся ён у Дзень маці, 14 кастрычніка, а скончыцца 21 кастрычніка, у Дзень бацькі. У гэты час праходзіць шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных сямейным каштоўнасцям і традыцыям.

Ініцыятыва аб заснаванні Дня бацькі прагучала падчас звароту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 28 студзеня 2022 года. У выніку Указам Прэзідэнта ад 9 чэрвеня 2022 года было ўсталявана новае свята — Дзень бацькі.

Дата 21 кастрычніка ўзнікла невыпадкова. 14 кастрычніка адзначаецца Дзень маці. З'явілася ідэя з 14 да 21 кастрычніка арганізаваць «бацькоўскі тыдзень». Гэтымі днямі праводзяцца розныя мерапрыемствы, прысвечаныя сям'і, мацярынству і бацькоўству, дабрачынныя акцыі для дзяцей.

У Дзень маці ў Мінску прайшоў фінал V Рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». Падчас Тыдня бацькоўскай любові адбудуцца прамыя тэлефонныя лініі з супрацоўнікамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па пытаннях дзяржпадтрымкі сем'яў з дзецьмі, круглыя сталы па фарміраванні здаровага ладу жыцця, канцэрты, выстаўкі, спартакіяды, духоўныя сустрэчы.

Напрыклад, 21 кастрычніка Міністэрства па надзвычайных сітуацыях арганізуе конкурс «Сямейнае прызванне». Міністэрства абароны з 14 да 21 кастрычніка праводзіць конкурс сярод асабовага складу ў злучэннях, воінскіх часцях і арганізацыях Узброеных Сіл на найлепшы аповед пра ваенныя ці працоўныя сямейныя дынастыі «Па прыкладзе бацькоў».

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

У ДУМКАХ, У СЭРЦЫ, У ДУШЫ...

У краіне новае свята — Дзень бацькі. Адзначаць яго будзем заўтра, 21 кастрычніка, маючы нагоду сказаць добрыя словы сваім татам. А нашы героі робяць гэта сёння.

Анастасія ЦІХАНОВІЧ:

«Мне вельмі яго не хапае»

Аляксандр Ціхановіч быў народным артыстам не толькі па афіцыйным званні, але і па сваёй сутнасці. Самы маркотны канцэрт ператвараўся ў яркі і душэўны, калі на сцэну выходзіў творча-сямейны дуэт Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча. Ён лічыў, што яму ў жыцці шмат дадзена, і шчодра дзяліўся з людзьмі, займаўся дабрачыннасцю.

Цяпер яго дачка Анастасія не толькі працягвае музычную дынастыю, але па прыкладзе бацькі актыўна падтрымлівае розныя дабрачынныя мерапрыемствы.

— Для мяне адзін з найлепшых людзей на свеце — мой Тата, — кажа спявачка Анастасія Ціхановіч і просіць слова «тата» пісаць з вялікай літары. — Адносіны дачкі і Таты — заўсёды вялікая шчырасць, мілата, радасць, маленькая таямніца, асаблівае цяпло. Любоў.

У Таты было чаму павучыцца: яго творчай стараннасці, уменню разумець людзей, дараваць крыўды, быць міласэрным, дапамагаць, бачыць добрае, рабіць дабро. Казаць.

...Нам падабалася катацца на машыне, мы проста садзіліся ў аўтамабіль і ехалі па нейкіх яго ці маіх справах, размаўлялі пра ўсё, слухалі музыку. А калі я стала старэйшай, скончыла інстытут, прыдумлялі новыя праграмы, абмяркоўвалі, што б такое цікавае і творчае можна было б зрабіць... А потым рабілі. Менавіта так з'явіліся многія праекты, якія сталі ў свой час знакавымі ў музычнай і тэлевізійнай сферы.

Сёння мне вельмі яго не хапае. Проста прысутнасці, цёплай усмешкі. Проста бачыць, як ён ідзе сваёй асаблівай хадой. Проста абняць.

Ён валодаў дзіўнай энергіяй, вельмі светлай, вельмі добрай. Мусіць, таму многія кажуць, што, сустрэўшы яго ўпершыню, узнікала адчуванне, што даўно яго ведаеш.

Я дзякую Богу за тое, што абраў для мяне такога Тату. Веру, што мы былі, ёсць і заўсёды будзем адно ў аднаго. У думках, у сэрцы, у душы...

Уладзімір ГРОМАЎ:

«Мне перадалася татава грунтоўнасць»

Уладальнік прыгожага барытону, адзін з самых запатрабаваных салістаў Вялікага тэатра Беларусі Уладзімір Громаў вельмі далікатна ставіцца да сваіх бацькоў. Ён упэўнены, што падмурак шчаслівага жыцця чалавека закладваецца ў дзяцінстве бацькамі. І цяпер, калі ён ужо сам бацька дваіх сыноў, дакладна ведае, што ў яго жыцці гэты падмурак вельмі моцны.

— Мой тата ўсё жыццё выкладае ў музычных школах, — гаворыць Уладзімір Громаў, народны артыст Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў. — Калісьці ён быў і маім педагогам па класічнай гітары ў 2-й музычнай школе Мінска, зараз ён працуе ў 1-й школе, і сярод яго вучняў — мой малодшы сын Фёдар.

Мая мама — спявачка, і бацькі арыентавалі мяне на музычную кар'еру. Мне і самому падабалася, хоць я не з тых дзяцей, якія гатовы былі гадзінамі сядзець за інструментам. Мне падабаўся вынік, калі ўжо ўсё вывучана, сыграна, а вучыць ноты, адточваць тэхніку — тут, вядома, бацькі мяне падбадзёрвалі. Недзе ў падлеткавым, можа, больш раннім свядомым узросце я зразумеў, што мае бацькі шчаслівыя ў прафесіі. Для іх музыка — работа, хобі, адпачынак, гэта значыць, яны вельмі ўдала выбралі свой прафесійны шлях. Бачачы гэта, я пайшоў па іх слядах, прычым спярша па татавых — як гітарыст, потым па маміных — як вакаліст.

Да гэтага часу вельмі цёпла ўспамінаю свае першыя выступленні ў дуэце з татам. Гэта былі канцэрты ў мінскіх парках. Колькі б артыст ні выступаў, ён хвалюецца перад канцэртам ці спектаклем. А мне вось гадоў у дзевяць было зусім не страшна, бо тата быў побач.

Кожнае лета мы ездзілі ў адпачынак на поўдзень, як тады казалі, «дзікунамі», гэта значыць здымалі нейкае памяшканне ў мясцовых жыхароў. А потым у ход пайшла палатка. Але яна цяжкая, і таму пазней мы ўжо на месцы набывалі шчыльны поліэтылен і канаты, каб самім змайстраваць палатку. У мае абавязкі ўваходзіла здабываць пітную ваду, часам даводзілася хадзіць па яе кіламетраў пяць у адзін бок. Ежу гатавалі на вогнішчы. Гэта быў класны адпачынак. З намі побач былі іншыя турысты і амаль усе з гітарамі. Па вечарах збіраліся і спявалі. З таго часу ведаю ўвесь бардаўскі рэпертуар. Тата даваў мне заданне — запісаць мелодыі новых песень. Тады гэта было як нейкая забаўка, а зараз дапамагае ў прафесіі, таму што магу запісаць любую мелодыю ў зручнай для мяне танальнасці.

Для мяне тата — яшчэ і прыклад у побыце. Ён вельмі шмат рабіў сам, заўсёды грунтоўна рыхтаваўся. Гэта цяпер у інтэрнэце можна знайсці любы майстар-клас, інструкцыю, а тады адно кнігі і часопісы былі ў дапамогу. Толькі ўсё праштудзіраваўшы, ён прыступаў да працы, і гэтая яго грунтоўнасць мне таксама перадалася. Дзякуючы тату ў мяне няма страху ўзяць у рукі перфаратар ці пілу.

Бацькі ніколі не вучылі мяне, як трэба жыць, яны — проста годны прыклад для пераймання, і я іх вельмі люблю.

Анастасія ГУНІНА:

«На сямейнай радзе за ім — галоўнае слова»

Існуе меркаванне, што з творчымі людзьмі могуць ужыцца толькі калегі. А вось Анастасія Гуніна, артыстка беларускай эстрады, педагог па вакале, удзельніца тэлевізійных праектаў, лічыць, што вельмі добра, калі ў сям'і ёсць чалавек іншай прафесіі. А каб ужыцца, патрэбны ўзаемапавага і каханне.

— Пачынаць аповед пра майго тату трэба з моманту знаёмства з мамай, таму што гэта вельмі прыгожая гісторыя, — кажа спявачка Анастасія Гуніна. — Сустрэліся бацькі ў Таліне. Мама ў той час была на гастролях з народным ансамблем беларускай песні «Церніца», а тата быў мараком і толькі што вярнуўся з рэйса. Мама, шпацыруючы па вулачках Старога горада, падвярнула нагу. Тата на руках данёс яе да атэля. Праз тры месяцы яны пажаніліся. Паколькі мама з'яўлялася выканаўцай беларускіх народных песень, тата вырашыў пераехаць з Сыктыўкара ў Мінск. Спачатку ён яшчэ хадзіў у мора, але потым усё ж прыняў рашэнне сысці на бераг. Вядома, ён гэта зрабіў дзеля сям'і, каб не расставацца з намі надоўга.

Як адзінаму дзіцяці, мне дастаюцца ўся бацькава любоў, клопат і падтрымка.

Калі я выбірала прафесію, ён адобрыў маё рашэнне. І лічыць, што дзве артысткі ў сям'і — гэта не шмат. Тата імкнецца наведваць нашы канцэрты, пасля кожнага выступлення дае слушныя парады як глядач. І гэта выдатна, бо погляд з боку для артыста вельмі важны, а тата яшчэ і крытыкуе, калі ёсць за што, вельмі тактоўна.

Тата сур'ёзны і нешматслоўны, з выдатным пачуццём гумару. Ён вельмі адказны, прывык без ваганняў брацца за пастаўленыя перад ім задачы і з бляскам вырашаць іх, за гэта яго паважаюць калегі. А яго жыццёвая філасофія вельмі простая: трэба быць сумленным з людзьмі і перад самім сабой, і тады ўсё будзе добра.

З мамай я звычайна абмяркоўваю творчыя пытанні, дзялюся нейкімі жаночымі сакрэцікамі. А да таты іду, калі трэба прыняць нейкае сур'ёзнае рашэнне, ён чалавек рацыянальны і практычны. Таму і на сямейнай радзе за ім галоўнае слова. А яшчэ, як кажуць, тата рукасты. У нас ёсць лецішча, дык вось амаль усё там зроблена татавымі рукамі. Гэта ўвогуле такі райскі куток, які ён да бясконцасці ўдасканальвае.

Скажу па сакрэце, існуе меркаванне, што жанчыны падсвядома параўноўваюць мужчын са сваім татам і выбіраюць тых, хто больш за ўсё на яго падобны. Я не выключэнне.

Валерый МУЛЯВІН:

«У асобе бацькі я знайшоў сапраўднага сябра»

Кожны артыст класічнага складу ансамбля «Песняры» скажа, што адносіны Уладзіміра Мулявіна да свайго малодшага сына Валерыя — прыклад бязмежнай бацькоўскай любові. Нават на падмурку загарадnага дома Уладзіміра Мулявіна быў адбітак далоні маленькага Валеры. А колькі ў сямейным архіве фатаграфій, на якіх сын побач з бацькам. Усюды: дома, на рэпетыцыі, на футбольным матчы.

— Мой тата быў выдатным музыкам і стваральнікам ансамбля «Песняры», ён цалкам аддаваў сябе творчасці, але, нягледзячы на загружанасць, заўсёды знаходзіў магчымасць быць побач, браць мяне на гастролі, рэпетыцыі і работу ў студыі. Мне вельмі пашанцавала, што ў асобе бацькі я знайшоў сапраўднага сябра, — кажа Валерый Мулявін. — Мы маглі гаварыць на розныя тэмы, дзяліліся самым патаемным. Вельмі любілі займацца спортам, нам заўсёды падабалася катацца на роліках і гуляць у футбол. Тата быў вельмі сціплым чалавекам, калі людзі, якія праходзілі побач, спрабавалі разгледзець яго на вуліцы, ён проста апускаў казырок сваёй кепкі на вочы, а калі ўсё ж замаскіравацца не атрымалася, то з усмешкай раздаваў аўтографы, — у вольную хвіліну мог спыніцца і пагаварыць — спакойна і паважліва, без фанабэрыі. Пачуццё гумару ніколі не пакідала яго, нават у самыя складаныя моманты. І таму ўсім здавалася, што ўсё лёгка ў яго жыцці. А на справе ўсё было складана і часам невыносна, перажыў і страту любімага брата, і жахлівую аварыю. Справіўся ж, тварыў, дарыў людзям радасць, і нават зараз, калі паклоннікі прыходзяць у яго музей, даведваюцца, наколькі мужным і мудрым ён быў.

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з асабістых архіваў герояў.

«Добры прыклад яшчэ нікому не нашкодзіў»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Які перыяд у выхаванні для вас быў самы цяжкі?

— Пасля нараджэння дачкі. Гульня «ўкладванне спаць» — гэта, напэўна, было самае складанае. Даводзілася ноччу па чарзе з жонкай калыхаць малечу ў калясцы па некалькі гадзін, каб яна заснула.

— Ёсць таты, якія баяцца праяўляць да дзяцей пяшчотныя пачуцці, асабліва да хлопчыкаў. Як часта вы абдымаеце дзяцей?

— Кожны дзень перад сном. Пры гэтым сын больш ласціцца, чым дачка. Калі дзеці былі меншыя, абдымаліся часцей. З узростам яны самі пачынаюць саромецца праяўлення пачуццяў. У нас ёсць хатнія жывёлы — афрыканскія смаўжы, дакладней, ужо адзін застаўся. Калі яны паміралі, у дачкі пачыналася дэпрэсія, слёзы. У такія моманты важна не абясцэніць пачуцці дзіцяці, а супераджываць. Таму стараюся суцешыць, абняць, пагладзіць па галоўцы, тлумачу, што яна ні ў чым не вінаватая і добра іх даглядала. Проста жыццё слімакоў кароткае — і гэта трэба прыняць. Лічу, цудоўна, калі тата праяўляе пяшчоту і гэта ў сям'і ўспрымаецца як норма. Калі здарыцца складаная сітуацыя, калі спатрэбіцца парада, трэба проста абняць, проста памаўчаць разам, і дзіця будзе шукаць падтрымку ў бацькоў.

— Ведаю сем'і, дзе мама прымушае піць горкія лекі і прыбіраць цацкі, а тата — добранькі — толькі і робіць, што прывозіць з камандзіроўкі падарункі. Вы строгі тата? Павысіць голас можаце?

— Магу, але стараюся гэтага не рабіць. Чалавек такая істота, якая прыстасоўваецца да ўсяго, раз крыкнуў, два крыкнуў... Хутка страх, які дзеці будуць адчуваць ад націску з твайго боку, пройдзе, і выніку ў далейшым не будзе. Калі браць прыклад пра добрага і злога паліцэйскіх, у нас дома хутчэй два «злыя» паліцэйскія. Каб я ці жонка ўсё дазвалялі, такога няма. Па першым часе дзеці спрабавалі, калі я сказаў «не», уціхую пайсці да жонкі «Мама, а можна...» Але мы гэта хутка «прасяклі» і спынілі. У выхаванні важны агульны падыход. Калі адзін нешта дазваляе, другі — не, то атрымліваецца лебедзь, рак і шчупак. Дзеці вельмі хутка вучацца маніпуляваць дарослымі, калі бачаць, што нехта можа даць слабіну. Яны абавязкова выкарыстаюць гэтую сітуацыю.

— Што можа даць дзецям толькі тата?

— Прыклад. Для хлопчыка гэта прыклад паводзінаў мужчыны ў будучыні. Колькі б разоў ты ні казаў, што сапраўдны мужчына павінен рабіць вось так, калі ты сам гэтага не робіш, то і дзіця наўрад ці будзе гэта рабіць. Альбо кажаш «не куры, курыць дрэнна», а сам пры гэтым паліш... Словы не павінны разыходзіцца са справай. А для дзяўчынкі тата — прыклад адносінаў мужчыны да жанчыны. І хлопчыкі, і дзяўчынкі, у якіх перад вачыма няма добрага прыкладу, абіраючы сабе пару ў будучыні, могуць памыліцца. Вядома, ад памылкі ніхто не застрахаваны. Але добры прыклад яшчэ нікому не нашкодзіў.

Пра музей Лега, баян ды прымус

— Як часта застаяцеся адзін на адзін са сваімі дзецьмі?

— Калі дачка толькі нарадзілася і жонцы патрэбна было да доктара, страшна было заставацца сам-насам з немаўлём. Але мінула пару месяцаў, і страх знік. Можаце мне не верыць, але за 11 гадоў ні разу не было сітуацыі, каб я званіў жонцы «дапамажы, не ведаю, што рабіць». Калі жонка выйшла на работу, у яе даволі часта былі курсы ў Мінску, у Маскве, яна з'язджала на тыдзень, на два. І малыя заставаліся на мне. Насамрэч гэта не так складана. Гатаваць я ўмею, галодныя дзеці не сядзелі. У доме ёсць і

пральная машына, і пасудамыйка. У многім старэйшая дачка ўжо дапамагае. Адна справа, калі ты раз на дзень па 30 хвілін перад сном бачыш сваіх дзяцей, а ўсё астатняе робіць жонка. Тады, калі застаешся сам-насам з сынам ці дачкой, у цябе будзе страх. А калі ты заўсёды побач, ніякіх праблем быць не можа.

— Таты ў Кітаі, паводле статыстыкі, удзяляюць сваім дзецям 55 хвілін у дзень, у ЗША — 42 хвіліны, у Расіі — усяго 6. Колькі часу ў дзень удзяляеце сваім дзецям вы? Як паміж працай, справамі, уласнымі інтарэсамі знаходзіць час на дзяцей?

— Ніколі не лічыў, але дакладна больш чым 55 хвілін. Зараз (на момант размовы. — ***Аўт.***) жонка хварэе, я сына ў школу адводзіў, гэта недзе хвілін 40 з раніцы, пакуль дапамог сабрацца, накарміў. Затым забіраў са школы. У нас такі звычай: калі разам куды-небудзь ідзём, гуляем з дзецьмі ў «гарады», «асацыяцыі», штосьці накшталт «кракадзіла». Так ісці цікавей. Пасля вяртання дадому дзеці садзяцца за ўрокі. Часам штосьці пытаюцца, просяць растлумачыць. Я ніколі не адмаўляю. Хоць, што хаваць, бывае, прыходзіш з працы з адным жаданнем — легчы, і каб ніхто не чапаў. Але ўсё адно трэба выслухаць, калі дзіця табе штосьці хоча сказаць і паказаць. Бо калі зараз сын ці дачка зразумеюць, што табе не важна, што з імі адбываецца, чым яны жывуць, то калі будзе адбывацца штосьці больш сур'ёзнае і важнае, магчыма, дзіця не будзе лічыць цябе тым, да каго можна звярнуцца па дапамогу і падтрымку.

— Дзесьці сустрэла такія даныя: парадку 60 % татаў хочуць зносіцца з дзецьмі, але не ведаюць, як. Што б вы ім параілі? Чым вы любіце займацца разам з дзецьмі? Ці адрозніваецца баўленне часу з дачкой і сынам?

— Самы просты спосаб бавіць час разам — нешта наведваць. Схадзіць у кіно, у тэатр, пагуляць па парку. Альбо купіць кветкі на цягнік і паехаць куды-небудзь у падарожжа. З сынам мы вучымся гуляць у шахматы. Ён часам спрабуе жульнічаць, маўляў, можна я вярну назад свой ход? Але са мной гэта не праходзіць: пахадзіў — значыць, пахадзіў — нясі адказнасць. Калі ёсць магчымасць, раю зацікавіцца тым, што цікава дзіцяці. Я не люблю камп'ютарныя гульні. Але калі мы былі ў Мінску ў музеі Лега, пагуляў на прыстаўцы з дзецьмі. Неабавязкова ўвесь час прыдумваць шмат гульняў. Дзеці самі прыдумаюць тое, што ім падабаецца. Тут галоўнае — не адштурхнуць дзіця, падтрымаць. З дачкой мы любім разам глядзець серыялы. І ёй, і мне даспадобы фэнтэзі. Падчас прагляду яна задае шмат пытанняў, спрабую на іх адказваць, тлумачыць штосьці. Сын вучыцца ў гімназіі з творчым ухілам, з мінулага года пачаў асвойваць баян. Мне таксама стала цікава, таму пачаў вучыцца іграць разам з ім. Нейкія простыя мелодыі ўжо магу адолець. Рэдкае дзіця з задавальненнем будзе сядзець дома і іграць на музычным інструменце. А вось калі ты просіш яго цябе навучыць, гэта іншы ўзровень падрыхтоўкі. Як настаўнік ведаю, што лепш за ўсё ты разумееш матэрыял, калі сам павінен камусьці яго расказаць, патлумачыць.

— Вы сказалі, што вас бацькі ў свой час прымусілі скончыць музычную школу...

— Так, калі я яе скончыў, сказаў сабе: усё, больш ніколі ў жыцці не падыду да фартэпіяна.

— Калі вашы дзеці захочуць кінуць музычную ці мастацкую школу, дазволіце гэта альбо прымусіце скончыць?

— Напэўна, усё ж такі прымушу скончыць. Бо насамрэч, калі з'яўляюцца нейкія цяжкасці, кінуць прасцей за ўсё. Бацькі для гэтага і патрэбны, каб дзесьці падказаць, прымусіць. Калі ісці па шляху найменшага супраціўлення, то ты нічаму ніколі не навучышся.

— Як у вас складваліся і складваюцца адносіны з вашым татам? Які галоўны ўрок ад яго вынеслі?

— Тата мне заўсёды паўтараў: сынок, што б ні адбывалася, ведай, што добрых людзей усё адно больш. Калі я казаў, што дзяцей трэба выхоўваць прыкладам, гэта я казаў і пра свайго бацьку ў тым ліку. Каб ён мяне караў ці вёў са мной філасофскія гутаркі пра тое, што такое добра і што та-

кое дрэнна, я не памятаю. Але ўсё дзяцінства летам я вольны час праводзіў разам з ім на практыцы ў студэнтаў. Ён выкладае батаніку ва ўніверсітэце, быў загадчыкам кафедры. Мне было прыемна бачыць, як яго паважаюць людзі, студэнты пра яго казалі заўсёды з павагай, любоўю. Мне хацелася, каб да мяне вучні, знаёмыя таксама так ставіліся.

Пра рыжыя вусы і непазбежнасць пакарання

— Сяргей Леанардавіч, вы не толькі вучыце дзяцей у звычайнай школе, але і з'яўляецеся мадэратарам у Тата-школе ў Віцебску. На мужчынскіх сустрэчах абменьваецеся досведам. Якая парада асабіста для вас была самай каштоўнай?

— Шмат каштоўнага можна ўвогуле пачуць на такіх сустрэчах. Адзін тата з Мінска расказваў, як ён матываваў дачку на вучобу. Ён даходліва патлумачыў дзіцяці, што вучоба — не татаў клопат, тата сваё адвучыўся. Ад таго, як ты будзеш вучыцца, залежыць твая ўласная будучыня. Калі хочаш быць паспяховай у жыцці, трэба самой пастарацца, прыкласці намаганні. Пры гэтым абавязкова важна сказаць, што на тату яна можа разлічваць, ён падтрымае ў любой сітуацыі. Такая размова важная, патрэбная. Я таксама правёў яе са сваёй дачкой. Не скажу, што адразу ўбачыў эфект, але, тым не менш, зрухі ёсць. Пасля нашай размовы малая пачала цікавіцца рознымі прафесіямі і англійскай мовай.

— Кажуць, што дачка праецыруе вобраз таты пры выбары будучага мужа. Вы хацелі б, каб ваш будучы зяць быў падобны да вас? І ці падобныя вы з цесцем?

— У цесця рыжыя вусы, і ў мяне рыжыя вусы *(смяецца)*. Ён таксама вельмі спакойны, стрыманы. Вось яшчэ жонка падказала: мы абодва добрыя і неабыякавыя да людзей. Што датычыцца будучага зяця, у прынцыпе я быў бы не супраць падабенства, бо я сябе ўсё ж люблю, цаню свае якасці.

— Як рэагуеце на недапушчальныя паводзіны дзяцей — падман, бойку? Ці ёсць паняцце «пакаранне» ў вашай сям'і?

— Тэлефон некалькі разоў забіраў. Важна не жорсткасць пакарання, а непазбежнасць. Няхай яно будзе не вельмі суровае — галоўнае, каб дзіця разумела, за што.

— Бацькоўства — гэта не толькі радасць, але і трывога, шок, сполах. Калі апошні раз адчувалі штосьці падобнае?

— У 4 класе дачка вучылася ў другую змену. Я ведаў, што яны з сяброўкай у той дзень дзяжурылі па класе. Гляджу на гадзіннік, павінна ўжо вярнуцца са школы, а яе ўсё няма і няма. Тэлефон выключаны. Ужо збіраўся бегчы шукаць, як у кватэру забягае задаволеная жыццём дачка. З усмешкай з парога расказвае, як яны здорава падзяжурылі сёння... У такія моманты хочацца накрычаць. Але спакойна тлумачыш, што бацькі перажываюць, што тэлефон не проста так дадзены. Яна, аказваецца, выключыла яго, каб на ўроку не званіў, і забылася ўключыць. Дзеці павінна зразумець, што прасцей патэлефанаваць і папярэдзіць, чым потым глядзець на злосных бацькоў.

— Ва ўсіх сем'ях ёсць казусы з серыі: «Аднойчы мама пайшла па прадукты...»

— Я дзяцей укладваў спаць і ўрэшце сам заснуў, а яны — не. Потым хадзілі па кватэры: «Мама, ціха! Тата спіць, не разбудзі».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з асабістага архіва героя.

Мама, я вырас!

Адкуль бяруцца сапраўдныя мужчыны?

Завабныя аб'явы накшталт «раскрыйце ў сабе жанчыну» цяпер можна сустрэць паўсюль. Гэткая рэклама моднай дзейнасці сучасных коўчаў і іншых спецыялістаў, якія абяцаюць змяніць ваша жыццё ў імгненне вока. І тут згадваецца выраз «жанчынамі не становяцца — імі нараджаюцца». А пасля яшчэ адзін: «кожная жанчына марыць сустрэць сапраўднага мужчыну». Аднак які ён, як яго распазнаць — тут ужо могуць быць розныя варыянты. Таму сёння паспрабуем разабрацца ў тым, як трэба выхоўваць хлопчыкаў, каб яны сталі сапраўднымі мужчынамі.

— Само паняцце «сапраўдны мужчына» вельмі шырокае, і я тут бы ўсё ж гаварыла пра асобу. Што гэтая чалавек, які адбыўся, які мае свае погляды, пазіцыі і здольны іх адстойваць. Ён незалежны, спакойна можа праяўляць сябе і ўпэўнена крочыць па жыцці, — адзначае **псіхолаг Вера ПРОХАРЧЫК.** — Такі мужчына жыве па закліку сваіх унутраных адчуванняў, бо ён самадастатковы, і гэта дае яму апору.

Адмовіўшыся ад яго дапамогі, я пазбаўлю сваё дзіця вопыту і, магчыма, нават жадання прапанаваць мне дапамогу заўтра.

Вядома, у кожнага будзе сваё пэўнае ўяўленне пра тое, якімі характарыстыкамі павінен валодаць сапраўдны мужчына. Калі ж звузіць гэтае паняцце і разглядзець у кантэксце сям'і (паколькі менавіта там дзеці часцей за ўсё назіраюць ролі мужчынскіх паводзін), то могуць з'явіцца і новыя акцэнты. Таму што там ужо праяўляецца ўменне быць прыкладам, несці адказнасць за тых, хто побач, удзельнічаць у выхаванні дзяцей. З апошняга ўсё і пачынаецца. Прычым усе ж ведаюць, што выхоўваем мы дзіця нават тады, калі проста знаходзімся побач.

— Раней інстытут сям'і быў больш аўтарытэтны і сямейныя каштоўнасці перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Так, мужчына заўсёды ўспрымаўся як здабытчык, а жанчына — як адказная за дамашні ачаг. Дык вось «здабытчык» — гэта пра тое, каб здабываць, быць недзе нават крыху агрэсіўным, ставіць мэты і дасягаць іх. Пры гэтым заставацца эмацыянальна ўстойлівым, самастойным, рашучым, — працягвае спецыяліст. — І калі мы гаворым пра выхаванне такіх якасцяў, то гэта пачынаецца ўжо ў тыя моманты, як дзіця заяўляе пра сябе з дапамогай сваіх «хачу», праяўляе да чагосьці інтарэс. Ужо ў такіх сітуацыях вельмі важна даваць дзіцяці магчымасць спрабаваць, каб напрацоўваўся вопыт. Ні ў якім разе не варта ігнараваць гэту ініцыятыву. Таксама у выхаванні хлопчыка можа нашкодзіць маміна гіперапека, асабліва там, дзе ён можа справіцца сам. І, безумоўна, для малога важна пераймаць паводзіны бацькі. Тут і мужчынскія ролевыя гульні, і паездкі на рыбалку, і нейкая праца з малатком, гаечным ключом і іншае.

Калі ж у сям'і няма таты, то даць такі важны для сталення пакуль яшчэ маленькага мужчыны вопыт могуць родзічы (дзядуля, дзядзька, старэйшыя браты) альбо трэнер, выкладчык, нават знаёмы вашай сям'і. Самае галоўнае, каб прыклад для пераймання быў добры. Напрыклад, ваш сын можа класна бавіць час са сваім хросным бацькам альбо са стрыечным братам, які можа і ў футбол з ім паганяць, і дапамагчы змайстраваць шпакоўню...

А вось калі ў хлопчыка ёсць мама і тата, усё значна прасцей. Хоць, вядома, у першы год малечы больш неабходна мама, яе ўвага, клопат і любоў. Аднак потым важна, каб яна паступова адпускала дзіця ў свет мужчынскіх узаемаадносін. У адваротным выпадку, асабліва калі мама яшчэ і дзейнічае з пазіцыі «ён жа ў мяне такі маленькі», гузік не зашпіліць, дзіця не толькі ў тры, але і ў шэсць нічога не будзе рабіць. Лепш акцэнтаваць увагу сына на тым, што ён малайчына, абавязкова справіцца і ўсё ў яго будзе добра! Нікому ж не хочацца атрымаць праз нейкі час дарослага інфантыльнага мужчыну, за якога ўсё павінна рабіць мама альбо жонка.

Нядрэнна ведаць таксама, што пры неабходнасці мужчына абароніць і дапаможа. Таму важна з малых гадоў выхоўваць хлопчыка моцным і здаровым. Калі ў дзіцяці будуць умовы для заняткаў спортам, гэта абавязкова пойдзе яму на карысць. Тады ваш хлопчык зможа і ў школе быць у аўтарытэце, і сябра абароніць, калі што, а таксама вам дапамагчы, скажам, данесці цяжкія пакеты з крамы. Можна гуляць з сынам, катацца на веласіпедах, хадзіць у паходы — словам, праводзіць час так, каб і карысна было, і ўспаміны засталіся. Мне як маме часам даводзіцца назіраць, як сын бярэцца дапамагаць — і прадукты несці з крамы, і за пылосос хапаецца альбо просіцца памыць посуд — тады, прызнаюся, унутры здараецца барацьба, бо першая думка аб тым, што сама ўсё зраблю лепш і хутчэй. Але, адмовіўшыся ад яго дапамогі, я пазбаўлю сваё дзіця вопыту і, магчыма, нават жадання прапанаваць мне дапамогу заўтра. А праз некалькі гадоў ужо буду наракаць, што ён лянівы і зусім нічога не робіць, толькі з сябрамі бавіць час альбо ў камп'ютары сядзіць.

«Таксама нашкодзіць у выхаванні хлопчыка маміна гіперапека, асабліва там, дзе ён можа справіцца сам».

Асобна спынюся на тым, як дзейнічаць бацькам, калі дзіця памылілася ці пацярпела няўдачу. Такія эпізоды здольныя добра «ўразацца» ў нашу памяць і потым нагадваць пра сябе ў дарослым жыцці. Псіхолагі сыходзяцца ў меркаванні, што калі дзіця расце ў атмасферы забарон, строгасці і пакаранняў за самую нязначную правіннасць, то існуе рызыка выбрасці альбо жорсткім і пакрыўджаным на ўвесь свет, альбо вельмі няўпэўненым у сабе. Ні адно, ні другое не вядае да паспяховай рэалізацыі хлопчыка ў перспектыве — як у працы, так і ва ўласнай сям'і. Я не за ўсёдазволенасць, але вучыць дзяцей адказнасці за свае ўчынкі трэба правільна.

— Ёсць пэўны стэрэатып, быццам мама больш любіць дзіця і таму шкадуе, а тата «адказны» за строгасць, межы і пакаранне. Аднак насамрэч не так істотна, хто пакарае, як тое, каб дзяцінку ў гэтым напрамку былі ўзгодненыя паміж абодвума бацькамі. Калі мама і тата з дзіцем абгаворваюць, што такі вось учынак будзе мець пэўныя наступствы і пакаранне, і гэта правіла ў нашай сям'і, то менавіта так сын яго і засвоіць, — тлумачыць Вера Прохарчык.

Вялікай памылкай з боку бацькоў будзе забараняць хлопчыку выказваць свае пачуцці. Папраўдзе, ніколі не разумела, калі даводзілася чуць «не плач, ты ж мужчына», «нічога страшнага не здарылася, ты проста ўпаў» і гэтак далей. Безумоўна, не варта перабольшваць і надаваць сітуацыі маштабы сусветнай катастрофы, але і абясцэньваць, і зневажаць пачуцці маленькага чалавека, лічу, не варта. Зусім нядаўна па дарозе ў садок мой сын спатыкнуўся і ўпаў. Я не стала чакаць і, дапамагаючы яму ўстаць, мякка сказала: «Ты проста, як коцік, прызямліўся на лапкі — і ніводнай драпінкі». Малы, які гатовы быў заплакаць, паглядзеў на мяне і ўсміхнуўся.

Топ-5 парад бацькам хлопчыка:

1. Давайце свайму дзіцяці свабоду і прастору для ініцыятывы, але няхай яно заўсёды ведае, што вы, калі раптам што, побач.
2. Ацэньвайце ўчынкі, а не асобу сына. Бо вашы ацэнкі дзеянняў дзіцяці могуць негатыўна адбіцца на яго самаацэнцы.
3. Не крытыкуйце і не прыніжайце мужчын у прысутнасці сына, бо гэта дасць яму падставу думаць, што яны (у тым ліку і ён) нічога не вартыя і іх меркаванне не мае значэння.
4. Цікаўцеся падзеямі дзіцяці адносна падзей у свеце і ў вашым жыцці, а пасля ўважліва слухайце яго адказы.
5. Любіце свайго сына і верце ў яго, нягледзячы ні на што.

Вядома, раней я магла пачаць бурчаць: маўляў, чаго ты пад ногі не глядзіш ці нешта ў такім ключы, але нічога, акрамя сапсаванага настрою, у нас дваіх гэта не пакінула б. Таму ў нейкі момант я пачала сябе перавыхоўваць і асабліва ў форс-мажорных выццёвых сітуацыях адсочваць сваю рэакцыю і дзеянні. Нават калі часам дома злуюся ці адмаўляюся выконваць нейкае яго жаданне тут і цяпер — тлумачу сыну прычыну. Бо дзецям у гэтым жыцці найбольш патрэбныя наша любоў, павага, разуменне і падтрымка. Асабліва востра тое адчуваецца і ў падлеткавым узросце.

— У любым выпадку ўсё фарміруецца з дзяцінства. Калі ў сям'і адносіны будуюцца на даверы і павазе і хлопчык бачыць, як бацькі падтрымліваюць яго самастойнасць, паважаюць яго выбар, то наўрад ці ён дазволіць некаму, напрыклад, з сяброў ці чужых людзей маніпуляваць сабой. Такія дзеці ўмеюць адстойваць сваю думку і не ісці за натоўпам, — кажа спецыяліст. — Дзеці, бывае, ужо ў дзесяць гадоў кажуць «гэта мой пакой, мой беспарадак», тым самым абазначаючы свае межы. І калі мама і тата ўважлівыя ў гэтыя моманты і не ўспрымаюць усё з пазіцыі «ды хто ты такі, каб так казаць, тут усё на нашы грошы куплена» і г. д., а, наадварот, разумеюць, што іх дзіця сталее, то любыя працэсы будуць лягчэй працякаць. Патрэбен баланс у тым, каб вы чулі сваё дзіця і не страцілі аўтарытэт у яго вачах. Напрыклад, хочаш гуляць — ідзі, але пакуль ты непаўналетні, то вяртайся дадому не позна. Толькі праз такую павагу можна пабудаваць адносіны.

Галоўнае — не спадзявацца, быццам усё складзецца само: што ў школе навучаць, у інтэрнэце адказы знойдзе ці ў арміі з сына сапраўднага мужчыну зробяць. Тады ўжо будзе позна, бо ў той жа арміі невядома, у якое асяроддзе ваша дзіця трапіць, хоць там і будуць рэжым і правілы. Але як гэты вопыт адаб'ецца на яго асобе — прагноз індывідуальны, як і ў іншых месцах. А ў школе не факт, што ў настаўнікаў ёсць час на гэта, паколькі там галоўнае — ці цягнеш» ты праграму, ці ўкладаешся ў нарматывы… Жыццё — яно больш шматграннае. У ім нам патрэбны не толькі добрыя веды, але і ўменне правільна іх прымяніць. А галоўныя, нязменныя настаўнікі ў гэтым для нашых дзяцей — толькі бацькі з моманту іх нараджэння.

Алена ДРАПКО.

ДЗЕНЬ БАЦЬКІ ЗАВЕРШЫЦЬ ТЫДЗЕНЬ БАЦЬКОЎСКАЙ ЛЮБОВІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Мінскі гарвыканкам, рэспубліканскае дабрачыннае аб'яднанне «Клуб ільвоў» сумесна з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны 21 кастрычніка арганізуюць рэспубліканскі форум «Быць татам цяпер!». Мерапрыемства ставіць сваёй мэтай прыцягнуць увагу да тэмы свядомага бацькоўства, удзелу таты ў жыцці і выхаванні сваіх дзяцей, рабоце па доме, папулярызацыі здаровага ладу жыцця ў сям'і і ўмацавання сямейных каштоўнасцяў. Падчас форуму будзе арганізавана шэсць дыскусійных пляцовак, дзе ўдзельнікі абмяркуюць пытанні практычнай работы «Тата-школ» і ролю бацькі для дзіцяці, гарманічнае развіццё дзяцей рання га ўзросту, канфлікты ў сям'і, мужчынскае здароўе, эмацыянальны інтэлект мужчыны, прафілактыку стрэсаў і выгарання.

Міністэрства ўнутраных спраў і Гродзенскі аблвыканкам правядуць фінал рэспубліканскай акцыі «Сям'я! Служым разам!». А па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ў «бацькоўскі тыдзень» праходзіць праект «Тата-зала». Мужчыны ў гэты тыдзень могуць бясплатна трэніравацца разам з сынамі ці дочкамі.

У Дзень бацькі мужчыны з дзецьмі могуць бясплатна наведаць некаторыя музеі, у прыватнасці Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» і замкава-паркавы комплекс «Мір».

Дзень бацькі адзначаецца амаль у 60 краінах свету. У Расіі ён святкуецца ў трэцюю нядзелю кастрычніка, сёлета прайшоў 16 кастрычніка. У трох дзясятках краін, у тым ліку ЗША, Нідэрландах, Вялікабрытаніі, Францыі, Кітаі, Японіі, Казахстане, яго святкуюць у трэцюю нядзелю чэрвеня. А, напрыклад, у Італіі, Іспаніі і Партугаліі — 19 сакавіка.

Адзначаюць свята за мяжой па-рознаму. У Аўстраліі гэта нагода выбрацца на прыроду, у Фінляндыі спачатку ходзяць на могілкі і ўшаноўваюць памяць памерлых блізкіх, а затым арганізоўваюць свята дома. Магчыма, у беларусаў з'явяцца і свае традыцыі ў гэты дзень, а пакуль жа можна проста павіншаваць тату — асабіста, па тэлефоне ці хаця б паштоўкай.

Алена КРАВЕЦ.

На ўласным вопыце

ПАРТНЁРЫ ДОМА І НА ПРАЦЫ

Сумесны бізнес з сужэнцам: як дабіцца поспеху?

Існуе шмат кампаній, уладальнікі якіх — сямейныя пары. Абапіраючыся на асабісты вопыт (я — заснавальнік кансалтынгавай кампаніі) і кейсы кліентаў, магу сказаць, што ў 95 % выпадкаў такі бізнес непаспяховы. Далей раскажу, чаму так адбываецца, а таксама падзялюся парадамі, якія дапамогуць захаваць і сям'ю, і бізнес.

Асноўныя прычыны непаспяховасці

• Узаемадзеянне на рабоце разбурае рамантыку і глыбокую духоўную сувязь паміж мужам і жонкай.

• Асабістыя рознагалоссі ўплываюць на бізнес. Ёсць схема, па якой развіваюцца «сямейныя» кампаніі: хуткі старт, плато і згасанне.

Цяпер парады, якія дапамогуць вырашаць цяжкія сітуацыі ў партнёрстве з сужэнцам, сябрамі або сваякамі.

1. Не пачынайце сумесную работу

Гучыць радыкальна. Але ўявім: у мужа свой бізнес, жонка выйшла з дэкрэта, і ёй патрэбна работа. Муж разважае, ці варта ўзяць яе ў сваю кампанію. Калі ў мяне просяць парады ў такіх сітуацыях, я заўсёды ўдакладняю: а ці захаваліся ў пары рамантычныя адносіны?

Калі муж і жонка кахаюць адно аднаго, адчуваюць усю гаму палкіх пачуццяў — пачынаць працаваць разам не варта. Гэтым можна толькі ўскладніць сваё жыццё і падвергнуць рызыцы рамантычныя адносіны. А яны ж павінны напаўняць энергіяй, творчасцю і стварэннем. Лепш дапамагчы сваёй палавінцы пачаць уласны бізнес ці знайсці добрую работу.

2. Пераключайце ролі

Каб захоўваць і бізнес, і блізкія адносіны, трэба бездакорна падзяляць гэтыя дзве сферы. І муж, і жонка павінны згадзіцца з гэтым.

Калі вы прыходзіце на работу, то вы — бізнес-партнёры або кіраўнік і падначалены. Вы на 100 % павінны выконваць гэтыя ролі: адпаведна адносіцца адно да аднаго, выконваць абавязкі, даваць справаздачу, трэніраваць і навучацца. Але, пераступіўшы парог дома, вы тут жа пераключаецеся. Трэба выйсці з вобраза строгага начальніка і стаць клапатлівым сужэнцам.

Гэта дзейнічае. Але вы павінны быць надзвычай дысцыплінаваныя і кампетэнтныя, каб пераключаць ролі свядома. Любая праблема ў бізнесе ці ў сям'і будзе перашкаджаць, рызыкуючы «падарваць» усё. Менавіта таму я кажу, што толькі ў 5 % выпадкаў бізнес з сужэнцам, сваяком ці сябрам будзе паспяховы.

3. Станьце прафесійным менеджарам

Вядома, у сямейным бізнесе ёсць плюс — вы знаходзіцеся на адной хвалі. Пачынаючы сумесную справу, паказваеце, што давяраеце адно аднаму і гатовы аказваць падтрымку. Вы побач з чалавекам, які вас разумее і паглыблены ў праблемы вашай кампаніі. Але гэта тонкі лёд: каб ісці па ім, абое павінны стаць прафесіяналамі ў галіне кіравання.

У кампаніі неабходна ўкараніць зразумелую арганізацыйную структуру, дакладна падзяліць абавязкі. Увесці простыя правілы ўзаемадзеяння кіраўнікоў, пазначыць, якія канкрэтна вынікі вы жадаеце атрымліваць ад кожнага супрацоўніка. Абавязкова ўкараніце іх падвядзенне, каб разумець, як ідуць справы.

Мой досвед

Я на сабе зведаў, што такое сямейны бізнес. Хоць лічу сябе экспертам у галіне менеджменту, службовых абавязкаў і дзелавых узаемаадносін, але нават мне было складана. Я ўвесь час думаў аб бізнесе: гэта натуральна для прадпрымальніка. Мне хацелася гаварыць аб праблемах, шукаць шляхі вырашэння нават дома. Жонка таксама была ўцягнутая ў бізнес, таму цалкам пераключацца на рамантычныя адносіны не атрымлівалася. І гэта пры тым, што я — дысцыплінаваны чалавек. У выніку шлюб распаўся менавіта з гэтай прычыны.

Выснова

Добра арганізаваная сістэма кіравання, якую вы ўмела выкарыстоўваеце, дапамагае захаваць парадак. А таксама падзяляць асабістыя і працоўныя адносіны ў сямейным бізнесе. Вядома, гэта не вырашае праблемы на 100 працэнтаў, але значна павялічвае шанцы захаваць прыемныя адносіны паміж сужэнцамі. Не варта прыносіць іх у ахвяру свайму бізнесу.

Аляксандр ВЫСОЦКІ.

Дачны серыял

ПРАЗ СІЛУ НЕ БУДЗЕШ МІЛЫ

Калі заходзіць гаворка аб старшынях праўленняў садаводчых таварыстваў, часцей за ўсё іх абвінавачваюць у тым, што, маўляў, крадуць. Дарэчы, далёка не заўсёды гэта мае доказы. На самай жа справе — колькі старшыняў, столькі за імі розных «грахоў», відавочных або... прыдуманых незадаволенымі дачнікамі.

ЗА ШТО «З'ЕЛІ» ІВАНАВІЧА?

Пачатак сезона ў СТ супаў са сходам, на якім павінны былі выбіраць новага старшыню. Напярэдадні да нас на ўчастак прыйшла дэлегацыя на чале з «шэрым кардыналам» таварыства — энергічнай пенсіянеркай Соф'яй Сяргееўнай. Дама расчаравалася, пачуўшы, што мы — арандатары. Аказваецца, дэлегацыя лабіравала свае перадвыбарчыя інтарэсы.

Напрыклад, распавялі, якія дрэнныя былі папярэднія старшыні. Вось Валерый Іванавіч, скажам. Пры ім памянялі дачную падстанцыю. І хоць з тых часоў у таварыства ні разу не было праблем з электрычнасцю, аднак актывісты са «старой гвардыі» даведаліся: у суседнім СТ падстанцыю купілі на 1200 рублёў танней! (Праўда, пасля гарантыйнага рамонту.)

Довады Валерыя Іванавіча наконт таго, што наша СТ большае, падстанцыя новая і вялікай магутнасці, ніхто не чуў. Усе абураліся пераплаце, хоць каштарыс на замену падстанцыі, як і належыць, зацвердзілі на агульным сходзе. У выніку Валерыя Іванавіча без пашаны праводзілі з пасады...

КУЛЬТАРГАНІЗАТАР

Пасля яго старшынёй выбралі Наталлю Васілеўну.

«Такога «цуду» ў нас яшчэ не было», — праз год абураліся некаторыя дачнікі. Кантэйнерная пляцоўка занадта маленькая, у аўтакраму людзі хадзілі ў суседняе СТ або ў краму ў вёсцы, пачаліся перабоі з водазабеспячэннем... А Наталля Васілеўна тым часам праводзіла агляд-конкурс на найлепшую клумбу і на дом узорнага ўтрымання, а яшчэ — конкурс гародніны і садавіны незвычайнай формы. Казала: вы пачытайце класічную літаратуру — там пішуць, як людзі павінны бавіць час на лецішчы — культурна адпачываць. (Між тым актыўныя ўдзельнікі ўсялякага роду спаборніцтваў «прыгняталі» тых, хто ні ў чым не ўдзельнічаў.)

Галоўным дасягненнем Наталлі Васілеўны можна лічыць тое, што многія дачнікі паставілі высокія агароджы з металапрофілю або нацягнулі ахоўную сетку на рабіцу, каб актывісты не падглядалі, што робіцца на ўчастках.

ДУШЭЎНАЯ ЖАНЧЫНА

Наступным старшынёй стала Святлана Міхайлаўна. Яна паставіла справу так, што без яе ўдзелу электрык не мог замяніць вулічны ліхтар. Гэта значыць, ён мяняў, а яна стаяла побач і гучна кіравала. Пры тым усе глабальныя праблемы (найбольшая з вадой) заставаліся. Службы дастаўкі вады вельмі добра зарабляліся на насельніках СТ.

«Старая гвардыя» была задаволеная працай Святланы Міхайлаўны — душэўная жанчына, да кожнага зойдзе, з усімі пагаворыць. А праблемы? Дык дзе іх няма? Спадчыннікі і «чужыя» абураліся: маўляў, як было ў 1980-я, на тым узроўні і засталося. Праўда, гэтая катэгорыя дачнікаў менш за ўсё хадзіла на сходы. Таму старажылы былі ўпэўненыя, што Святлану Міхайлаўну абяруць на другі тэрмін.

НЕШТА ПАЙШЛО НЕ ТАК

Старажылы, узрадаваўшыся, што з'явілася вада, палівалі агароды, запаўнялі ёмістасці, мяркуючы, што кожны з іх адзін такі разумны, пакуль суседзі сядзяць на чарговым сходзе. На гэты раз прыйшлі ў асноўным спадчыннікі і «чужыя». Вось яны выказвалі прэтэнзіі. Святлана Міхайлаўна, якая прывыкла, што яе заўсёды хвалілі, разгубілася.

Слова ўзяў Дзмітрый Антонавіч. Выступіў кароткa, але па справе. Не плакаўся, што ад яго дома да кантэйнернай пляцоўкі кіламетр, а сказаў, што па нормах таварыству трэба пяць пляцовак, і з лічбамі даказаў, што неабходна яшчэ адна свідравіна з вадой... Удзельнікі сходу тут жа запатрабавалі ўнесці ў спіс для галасавання Дзмітрыя Антонавіча. Яго і абралі старшынёй праўлення большасцю галасоў, а ў склад праўлення ўвайшлі збольшага не тыя, каго лабіравала «старая гвардыя».

Увесь вечар СТ гудзела, Святлана Міхайлаўна і яе прыхільнікі думалі, як бы ўсё перайграць. Вельмі ўжо абураў іх гэты Дзмітрый Антонавіч — з чужакоў, два гады як купіў тут леціша, не ведае людзей і традыцыі. Ды і рэпутацыя няважная — у 56 гадоў прыстойныя людзі ўнукаў няньчаць, а ён з жонкай развёўся.

ДЛЯ СЯБЕ І ДЛЯ ЎСІХ

У праграмнай прамове новы старшыня сказаў, што адкрыты для ўсіх прапаноў па паляпшэнні жыцця ў СТ, і асабліва будзе рады людзям, якія гатовы ўдзельнічаць у рэалізацыі сваіх ідэй.

Праз пару дзён у дачным чаце нехта напісаў, што гатовы аддаць свой гульнявы комплекс, таму што дзеці выраслі. Праўда, у СТ ніколі не было дзіцячай пляцоўкі. Як не было абсталяванай тэрыторыі для правядзення тых жа сходаў — усе тоўпіліся на няўтульным лужку побач з воданапорнай вежай.

Вакол Дзмітрыя Антонавіча сапраўды згуртаваліся людзі, гатовыя нешта рабіць для агульнага камфорту. Праз дзесяць дзён пасля сходу з'явіліся лаўкі для ўдзельнікаў сходаў, абсталявана дзіцячая пляцоўка. Прычым ахвотных аддаць для яе ўсялякія дзіцячыя горкі і арэлі аказалася аж чатыры чалавекі. Дошкі, розныя жалязякі людзі таксама неслі, як і рэшткі цэменту, фарбы. Добраўпарадкаваннем заняліся ўсе, каму гэта было цікава.

ДРЭННЫ СТАРШЫНЯ!

Праўда, як кажуць, было і іншае меркаванне. Тая ж Соф'я Сяргееўна дакарала 73-гадовага Эдуарда Казіміравіча: маўляў, навошта ты ва ўсім гэтым удзельнічаеш? Сорак гадоў абыходзіліся без лавак! Ён адказаў, што яму цікава з нічога зрабіць цукерку, да таго ж толькі ў яго ёсць партатыўны зварачны апарат — як не дапамагчы суседзям?

А вось Людміла Іванаўна і сама не дапамагала, і зяцю забараніла, а калі ўсё было гатова, закаціла істэрыку: «Чаму няма батутаў? Мае ўнукі любяць батуты, а рукаход і карусель ёсць і ў гарадзе. Дрэнна працуе старшыня!» — зрабіла яна выснову.

Да канца сезона ў СТ з'явіліся яшчэ дзве кантэйнерныя пляцоўкі — для іх, дарэчы, няпроста знайсці месца, таму што размяшчаць трэба на пэўнай адлегласці ад дамоў.

Новая свідравіна таксама, як кажуць, далася ў знакі! Таісія Сямёнаўна бегала за старшынёй і рэкамендавала яму свайго зяця: маўляў, той працуе на буравой машыне. Але Дзмітрый Антонавіч адмовіўся ад «самадзейнасці», і фірму, якая бурыць свідравіны, выбіралі па конкурсе, ды яшчэ праверылі, каб тая мела ўсе ліцэнзіі-дазволы. Цяпер Таісія Сямёнаўна праклінае Дзмітрыя Антонавіча, а заадно і праўленне, таму што нанялі «фірмачоў», а не яе зяця. Ну, і зразумела, яе сяброўкі спрабуюць раздзьмуць чарговы скандал на гэтай глебе...

Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении **10 ноября 2022 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белстройматериалы»

Предмет торгов
Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-7114724 общей площадью 257,5 кв. м (наименование: помещение неустановленного назначения; назначение: помещение неустановленного назначения)
Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 48-1
Начальная цена: 33 048,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 3 300,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «Белстройматериалы», пр-т Партизанский, 99а, 220021, г. Минск, тел. (017) 342-71-92.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583, код платежа – 40901.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа на срок до 12 месяцев после заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **10 ноября 2022 года** в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.10.2022 по 08.11.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (017) 236-83-03, (029) 611-03-28.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 240-35-94, (029) 685-19-65 (ОАО «Белстройматериалы»).

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 5100763, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 3 года части капитального строения: помещений общей площадью 258,0 кв. м (помещения на 1-м этаже: 36,6; 99,2; 24,7; 14,1; 7,8; 14,5; 11,1; 3,5; 15,1; помещения в подвальном этаже: 11,2; 1,9; 3,9; 2,4; 6,1; 1,9; 1,4; 2,6 кв. м), расположенных в капитальном строении с инв. № 200/С-903 (наименование – здание многоквартирного жилого дома) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ильинского, 43. Целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,0. **Нач. цена:** 763,04 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 08.11.2022 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 18.10.2022 на сайте Государственного комитета по имуществу **https://au.nca.by/, http://www.gki.gov.by/** (№ 11710).

УНП 390477566

Информация об аукционе
по продаже земельного участка в частную собственность

